ЯКІХ ЖЫВЁЛІН НЕЛЬГА ТРЫМАЦЬ ДОМА? 5

ЯК СТВАРАЎСЯ І АДНАЎЛЯЎСЯ ПАСЛЯ ВАЙНЫ БДУ ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СЕРАДА № 207 (29576)

КАРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб узнагароджанні ордэнам і медалём Францыска Скарыны за ўзнятце Сцяга Перамогі і Дзяржсцяга Беларусі на вяршыню Эверэста.
- **Новы транспартна-лагістычны цэнтр пабудуюць паблізу пункта пропуску «Беняконі».**
- Рэгіянальныя адборы на конкурсы «Славянскага базару ў Віцебску» пачнуцца 23 лістапада.
- **Медыцынскі праект 103.BY запусціў сэрвіс анлайн-кансультацый з урачамі.**
- У Белавежскай пушчы пачалі падрыхтоўку да сезона зімовых свят.
- **Навукоўцы распрацавалі свяцільнік, які забівае каранавірус.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АРЛОЎСКІ, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:

«Нягледзячы на санкцыйны ціск на нашу краіну, эканоміка працуе, краіна застаецца прывабнай для транзіту. Больш за тое, транзіт праз Беларусь павялічваецца. Сёлета граніцу перасекла больш за 2 млн грузавых транспартных сродкаў, што на 10 % больш за леташнія паказчыкі. З пачатку 2021 года на 12 працэнтаў узрос і тавараабарот. Аб паспяховасці работы эканомікі, прадпрыемстваў краіны сведчыць рост паступленняў у бюджэт мытных плацяжоў. У 2021 годзе ў бюджэт ужо накіравана больш як Br8 млрд, што на 20 працэнтаў больш, чым у аналагічным перыядзе мінулага года. Гэтаму спрыяла і стварэнне камфортных умоў перасячэння граніцы, у тым ліку ўкараненне сістэмы электроннай чаргі».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Нельга спыняць лячэнне іншых хвароб»

Учора Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з лячэннем хворых на ковід на Гродзеншчыне на прыкладзе Лідскай бальніцы і параіў пераняць падыходы вобласці ва ўсёй краіне

Гродзенскі рэгіён заўсёды быў у ліку першых па многіх кірунках. Вылучыўся ён і ў барацьбе з каранавірусам. Дасягнуць невысокіх паказчыкаў захваральнасці ўдалося шмат у чым таму, што на чале вобласці — чалавек, які стаяў каля вытокаў айчыннай методыкі лячэння новага віруса, былы міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік. Пазнаёміцца з тым, як змагаюцца ўрачы з ковідам на Гродзеншчыне, і ці варта пераносіць іх падыходы на іншыя рэгіёны, прыехаў Прэзідэнт. СТАР. 2

Фота БелТА.

Надзейны транспарт Надзеі

Надзея ШАШКОВА, жыхарка вёскі Турск Рагачоўскага раёна, ездзіць на скутары ўжо трыццаць пяць гадоў, і за гэты немалы вадзіцельскі стаж у Надзеі Ільінічны толькі другі жалезны конік. У свой час скутар дапамагаў былому работніку раёнага камбіната бытавога абслугоўвання быць мабільным — даязджаць да працы, наведваць сваіх сталых заказчыкаў у вёсках, прымаць ад іх чарговыя заказы, своечасова адвозіць выкананую працу. Болей за сорак гадоў Надзея Шашкова была прыёмшчыцай комплексна-прыёмнага пункта ў санаторыі «Прыдняпроўскі». Падзяк у яе працоўнай кніжцы — не злічыць! Яшчэ дванаццаць гадоў працавала на пенсіі. Была старшынёй ветэранскай арганізацыі, дагэтуль старшыня гаражнага кааператыва.

Цяпер двухколавы сябар дапамагае пенсіянерцы выбірацца ў лес па грыбы, ездзіць да сына ў суседнюю вёску. Дарэчы, тэхнічнае абслугоўванне свайго сродку пераміяшчэння вяскоўка па магчымасці робіць сама.

— Тэхніка любіць адны рукі, — кажа першая ў раёне «байкерша». — Я ездзіла на ім і ў Гомель, і ў Бабруйск, а колькі па мясцовых прасёлках наматала, і ўсё без сур'ёзных паломак. Я вельмі дысцыплінаваны кіроўца!

У вадзіцельскіх правах Надзеі Ільінічны таксама парадак: ніводнай дзіркі ў талоне! А свае правы на кіраванне транспартам яна атрымала пяцьдзясят чатыры гады таму.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Жывіце ў бяспецы

ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ АГНЮ

Амаль кожны дзень на пажарах гінуць людзі

З пачаткам ацяпляльнага сезона ў супрацоўнікаў камунальных службаў работы дадаецца ў разы. Нарасхват у гэты час і ратавальнікі — па некалькі разоў на дзень па нумарах 101 і 112 паступаюць паведамленні аб пажарах. Аднак непрыемнасцяў і трагедый, якіх апошнім часам становіцца ўсё больш, можна было б пазбегнуць, калі б людзі своечасова і правільна падрыхтаваліся да халадоў...

Цыгарэта можа стаць апошняй

Толькі ў Мінскай вобласці за кастрычнік, які яшчэ нават не скончыўся, адбылося 100 пажараў, на якіх загінулі дзесяць чалавек. У прыватнасці, у Вілейскім раёне падчас адпачынку ў лазні абарвалася жыццё маладога мужчыны. Калі на месца выкліку прыбылі падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, на прысядзібным участку адкрытым полымем гарэў дах у прыватнай лазні. Як высветлілася, на момант узнікнення пажару гаспадар знаходзіўся ў хаце. Яго знаёмая, якая самастойна выйшла з ахопленай агнём лазні, атрымала апёкі. Яшчэ адзін аматар папарыцца пакінуць пабудову не змог — яго цела знайшлі на падлозе ў душавой. Чаму адбыўся пажар, устанаўліваецца.

Традыцыйна асноўнай прычынай пажараў з'яўляецца няспраўнасць пячнога ацяплення. Асаблівую групу рызыкі складаюць і тыя, хто з наступленнем халадоў пераносіць «курылку» ў ложак. Днямі ў Слоніме супрацоўнікі МНС выратавалі трох чалавек, якія атруціліся прадуктамі гарэння, — вінаватая непатушаная цыгарэта. Аднак усё магло скончыцца значна горш, калі б выпадковы сведка не паведаміў ратавальнікам аб задымленні ў адным з пад'ездаў шматкватэрнага дома па вуліцы Брэсцкай. Гаспадыня кватэры, дзе адбыўся пажар, сама звярнуцца па дапамогу не паспела: жанчына страціла прытомнасць на лесвічнай клетцы ў той час, калі ішла да суседзяў патэлефанаваць у МНС. Паколькі шчыльны дым трапіў і ў кватэры, якія размяшчаюцца вышэй, узнікла пагроза жыццю і здароўю іншых жыхароў. Ратавальнікі своечасова вывелі іх на свежае паветра. СТАР. 3

«Нельга спыняць лячэнне іншых хвароб»

КОВІД КОВІДАМ, АЛЕ РАБОТА НА ЗЯМЛІ ПА РАСКЛАДЗЕ

Прыляцеўшы ў Ліду, Аляксандр Лукашэнка найперш пацікавіўся, як ідуць справы з сельгаспрацаўнікамі. На гэты конт ён паставіў задачы: у сціслыя і аптымальныя тэрміны выканаць шэраг работ. У першую чаргу скончыць уборку кукурузы. Ён папярэдзіў віцэ-прэм'ера Аляксандра Субоціна, які адказвае за сельскую гаспадарку: «Барані бог, хоць дзесьці ў краіне пойдзе пад снег кукуруза, якую мы пакінулі на зерне».

Прэзідэнт паставіў задачу на працягу тыдня ў буйных гаспадарках на ўзворванні зяблева вывесці не менш чым па два трактары, а ў сярэдніх, малых — па адным. «Расслабіліся, далей няма куды! — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. — Дзе энерганасычаныя трактары? Мы ж тысячы энерганасычаных трактароў паставілі ў гэтым і мінулым гадах. Чым яны цяпер займаюцца?»

Аляксандр Лукашэнка ўказаў і на шэраг іншых канкрэтных недахопаў у правядзенні сельгаспрацаў, даўшы на гэты конт дакладныя даручэнні. «Гэта нецярпіма! Ні адзін губернатар не будзе працаваць, калі ў гэтым годзе зяблева не будзе ўзнята», — папярэдзіў Прэзідэнт.

МЕДЫЦЫНА З ПАТЭНЦЫЯЛАМ

Прыбыўшы ў бальніцу, кіраўнік краіны, перад тым як заслухаць даклады спецыялістаў, падзяліўся сваімі разважаннямі наконт розніцы ў цячэннях кавіду на Гродзеншчыне і ў іншых рэгіёнах краіны.

Фота БелТА.

Прэзідэнт растлумачыў: каб ацаніць узровень захворвання, бягучую хвалю параўноўвалі з першай. Цяпер Гродзенская вобласць (адзіная з усіх рэгіёнаў) далёка ад максімальнага ўзроўню захваральнасці ў першую хвалю. Мінск жа крыху вышэй за ўзровень, зафіксаваны ў пачатку пандэміі. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік расказаў, што цяпер у рэгіёне выкарыстоўваецца толькі траціну выдзеленых пад кавід ложкаў. Для лячэння кавіду выдзелілі 66 працэнтаў ад тых, што ёсць у рэгіёне, пунктаў эспіраторнай падтрымкі, занята з іх менш чым 80 працэнтаў.

Прэзідэнт адзначыў, што прадстаўнікі апазіцыйных сіл спрабуюць стварыць праблему на адсутнасці кіслароду. ***«З усіх кіслародных пунктаў у нас толькі 52 працэнты занята! Як гэта іх не хапае?!»*** — развянчаў Аляксандр Лукашэнка чарговы фэйк.

Уладзімір Каранік падзякаваў за выдатканыя сродкі рэспубліканскага бюджэту на закупку трох апаратаў КТ. Яшчэ адзін набыты за грошы вобласці. Яны ўстаноўлены ў Лідзе, Слоніме і Гродне.

Калі КТ-апараты ёсць ва ўсіх апорных бальніцах вобласці, то вось прылад МРТ не хапае. Кошт аднаго апарата даходзіць да 1,3 мільёна долараў. Дае даручэнне Прэзідэнт вырашыць праблему за будучы год. Прыборы для высокадакладнай дыягностыкі ёсць у Гродне і Астраўцы, неабходны яны таксама ў Лідзе і Ваўкавыску.

«Калі крыху трэба дапамагчы, скажаш. Трэба закрыць гэтую праблему, каб іншыя вобласці бачылі, як трэба працаваць, і гэтым шляхам ішлі. Без МРТ няма дыягназу і няма лячэння. МРТ — гэта дакладны дыягназ па многіх хваробах», — сказаў Прэзідэнт.

Губернатар далажыў, што рэгіён поўнасцю захаваў аказанне планавай дапамогі, і нагадаў, што пасля хвалі пандэміі магчымы «адкладзены запыт» з боку хворых пацыентаў. ***«Я казаў: ні ў якім разе нельга спыняць дапамогу людзям па іншых хваробах, закрываць планавыя аперацыі. Я вас прымусіў не рабіць гэтага. Ты правільна сказаў: ковід сыдзе, і на нас хлыне гэта «адкладзеная» анкалогія. У нас будуць чэргі на гэтыя аперацыі. Нельга спыняць лячэнне іншых хвароб»,*** — мяркуе кіраўнік краіны. У тэму ён пацікавіўся, калі скончаць будаўніцтва абласнога анкалагічнага дыспансера. Уладзімір Каранік паабяцаў увесці першую чаргу ў наступным годзе, а за два гады будаўніцтва поўнасцю завершаць.

Старшыня аблвыканкама прапанаваў механізм, як звязаць аплату працы медыкаў з ложкавым фондам. Заробак урача будзе залежаць ад колькасці аказаных паслуг. Ложкі скароцяць, але будуць трымаць на базе на ўсялякі выпадак. «Тады мы атрымаем кампактную медыцыну з высокім патэнцыялам, якая ў надзвычайным выпадку зможа разгарнуцца, бо мы захаваем кадравы патэнцыял, — выказаў думку Уладзімір Каранік. — Мы хочам прапанаваць варыянт, калі скарачэнне ложкаў не прывядзе да зніжэння колькасці медработнікаў і заробкаў. Калі атрымаецца, зможам рацыянальна выкарыстоўваць ложкі: не трэба — скарацілі, пандэмія — хутка разгарнулі».

ПЕРАДАВЫ ВОПЫТ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

Стабілізаваць сітуацыю ў рэгіёне з ковідам, па словах кіраўніка вобласці, дапамагла вакцынацыя. Першым кампанентам на Гродзеншчыне прышчэплены 31 працэнт жыхароў. Гэту лічбу сфарміравалі прадстаўнікі «зоны рызыкі» (тыя катэгорыі, што знаходзяцца ў пастаянным кантакце з насельніцтвам) — медыкі, настаўнікі, сацыяльныя работнікі.

Прэзідэнт адзначае, што, на яго думку, цячэнне хваробы ў кожнага пацыента рознае і залежыць у многім ад маральнага стану. «Усе зараз канцэнтруюцца на тым, што Прэзідэнт у «чырвоную зону» ходзіць і яшчэ не памёр. Адзін мярзотнік зрабіў заяву, але яна развіцця не атрымала, — «Лукашэнка не памірае, бо прышчапіўся нейкай замежнай вакцынай». Слухайце, у нас у краіне няма замежных вакцын. ***У нас, акрамя «Спадарожніка V» і кітайскай, няма ніякіх вакцын. І гэтыя вакцыны не горшыя»***, — упэўнены кіраўнік краіны.

Ён мяркуе, што прапановы завезці ў краіну еўрапейскія вакцыны і дазволіць імі прышчапляцца зыходзяць ад ахвотных з'ехаць з краіны. Прэзідэнт нагадаў яшчэ раз, наколькі апраўдана было рашэнне аб стварэнні ўласнай вакцыны і наколькі прышчэпка эфектыўная для захавання жыцця нават пры хваробе. Але настойвае на сваім падыходзе да праблемы: ***«Не трэба на грудзі каленам ціснуць чалавеку і шпрыцам калоць вакцыну. Я супраць гвалту. Трэба вакцынавацца, тады лягчэй пераносіцца хвароба і людзі амаль не паміраюць»***.

Прэзідэнт запэўнівае, што ён не супраць масак. Але, па яго словах, культура нашэння гэтага сродку індывідуальнай аховы ёсць толькі ва ўрачоў, бо яны ведаюць лепш за іншых, калі неабходна памяняць маску, як правільна адзець і зняць яе.

«Калі мы пачынаем ціснуць, некаторыя пачынаюць хадзіць у масках на вуліцах. Ідыятызм поўны, — кажа Аляксандр Лукашэнка. — А культура... Маску сунуць у кішэню і тыдзень не мяняюць яе».

На думку кіраўніка краіны, тэматыкай масачнага рэжыму спекулююць дэструктыўныя тэлеграм-каналы, якія жадаюць такім чынам выклікаць новыя пратэсныя настроі ў грамадстве. «Дэльта-штам больш небяспечны аказаўся. Яны гэта раскручваюць, каб пад рэферэндум падвесці і людзей выцягнуць на вуліцу. Вось у чым сутнасць», — сказаў Прэзідэнт.

Ён лічыць, што каштоўнасць падыходаў Гродзенскай вобласці ў лячэнні хворых — у лагістыцы. Ковід-хворых з раённых цэнтраў прывозяць у больш абсталяваныя і вялікія бальніцы. Таму ў вобласці меншая колькасць бальніц займаецца каранавірусными пацыентамі. «Тут не размазваюць ковід па ўсіх бальніцах, па ўсёй вобласці. Яны пачалі канцэнтраваць. Гэта дало свой вынік і ў грашовым выяўленні», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу міністра аховы здароўя Дзмітрыя Піневіча, што падобны вопыт варта пераймаць і ў іншых рэгіёнах.

Гледзячы на графік захваральнасці, Прэзідэнт звярнуў увагу, што Гродзенская вобласць нават не дасягнула піку і ўжо пачала падаць па ўзроўні захваральнасці. Зніжэнне адзначаюць па ўсіх абласцях, акрамя Мінска, які, на яго думку, «трэба кантраляваць больш жорстка».

ДЗЕ І КОЛЬКІ БУДАВАЦЬ?

Прэзідэнт адзначыў, што Уладзіміра Караніка неабходна падключыць да абмеркавання, дзе неабходна перадусім будаўніцтва новых медкарпусоў. Але асноўнае патрабаванне — іх функцыянальнасць. «Нам неабходна вызначыцца, дзе вось ніяк нельга не пабудаваць, — дадаў Прэзідэнт. — Перадусім гэта буйныя нашы 11 міжрэгіянальных цэнтраў. Іх трэба абсталёўваць. Калі неабходна сцены пабудаваць, купіць МРТ, КТ, лапараскоп, эндаскоп, мы гэтым будзем займацца. Мы і па Лідзе вызначымся. Потым паглядзім, колькі гэта будзе каштаваць, і я вам скажу, дзе мы возьмем гэтыя грошы».

Прэзідэнт прапанаваў стварыць новыя фонды, якія будуць фінансава дапамагаць краіне. «Створым фонд першага Прэзідэнта Беларусі, як ва ўсім свеце. Пад Прэзідэнта людзі грошы дадуць, разумеючы, што ўсё кантралюем, створым філіялы. Калі на Захадзе хтосьці хоча нам дапамагчы, дапамагайце і прыходзьце правярайце. І мы праз гэта атрымаем грошы. Дай бог іх засвоіць», — рэзюмуе думку Аляксандр Лукашэнка.

Пасля візіту ў «чырвоную зону» Прэзідэнт сустрэўся з працоўным калектывам Лідскай цэнтральнай раённай бальніцы, адказаў на пытанні медыкаў і журналістаў.

ПАВІННЫ ВЫТРЫМАЦЬ

Размову пачаў з пазітыўнага. «Калі Гасподзь нас будзе любіць, як да сёння, то да новага года не зусім сыдзем ад гэтай заразы, але супакоімся», — сказаў кіраўнік краіны і яшчэ раз падзякаваў урачам за іх працу.

Першае пытанне — пра магчымасці застаўацца на чарзе на ўласную кватэру пасля атрымання арэнднага жылля.

Асноўная праблема ў гэтым плане — грошы. Чалавеку дапамаглі з арэндным жыллём, а потым ён просіць падмогі і з будаўніцтвам кватэры. «Мы падумаем. Магчыма, трэба вызначаць нейкія катэгорыі, — дадаў Прэзідэнт. — Я ведаю гэту праблему. Кропкава вырашаем гэта пытанне ў Мінскай вобласці».

Прэзідэнт, размаўляючы з медыкамі, нагадаў пра няпростую сітуацыю на заходніх граніцах Беларусі.

«Учора ўжо «Леапарды» (танкі) падкінулі да нашых граніц. Ты, Юра (Караеў, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці. — **«Зв.»**), глядзі, ты ж генерал, што яны тут творыць. Своечасова падказвайце. Мярзотнікі, баюся, каб яны вайну не развязалі тут», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён растлумачыў, дарэчы, што інфляцыя павялічылася, бо замежныя краіны надрукавалі з-за пандэміі вялікую колькасць нічым не забяспечаных грошай.

«Мы імпартазалежная краіна. Мы нафту, газ, металы купляем і тут перапрацоўваем. Узняліся цэны. Калі цэны ўзняліся на трактар, узняліся і на паліва, і на прадукты харчавання. То-бок прыйшла інфляцыя з-за межаў. Калі тармазнуць, у стратах будуць усе прадпрыемствы», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што гэты перыяд неабходна перажыць.

Ён дадаў, што краіна вытрымае, калі людзі будуць чуць і слухаць словы кіраўніка дзяржавы.

«Пытанне не ва ўтрыманні ўлады Лукашэнкам. Не ў гэтым справа. Пытанне сёння ў нашых дзецях і кавалку зямлі, на якім жывём», — сцвярджае кіраўнік краіны.

ГЭТА Ж НАШЫ ЛЮДЗІ

Адно з пытанняў лідчан датычылася забяспечанасці дзяржавы энергіяй пасля ўвядзення БелАЭС. Прэзідэнт нагадаў, што напярэдадні выбараў альтэрнатыўныя кандыдаты прапанавалі закрыць атамную станцыю... «Сёння з уводам атамнай станцыі электраэнергіі залішне. Дзве электрычныя станцыі, што працуюць на прыродным газе, трымаем у халодным рэжыме, то-бок у рэзерве», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Будаўніцтва ўласнай станцыі выклікала нараканне заходніх суседзяў, па словах кіраўніка краіны, з-за канкурэнцыі, бо многія еўрапейскія краіны маюць свае АЭС. Пабудаваўшы станцыю пад кантролем расіян, адзначыў Прэзідэнт, мы атрымалі кампетэнцыі і вопыт работы над такімі маштабнымі энергетычнымі праектамі.

Прэзідэнт заявіў, што лішкі электраэнергіі мяркуюць пастаўляць Літве і Украіне, нягледзячы на праблемы ў адносінах. ***«Мы маглі б закрыцца і Літве не пастаўляць гэту электраэнергію. Хай купляюць у Еўрапейскім саюзе ў дзесяць разоў даражэй. Але людзей шкада, гэта ж нашы сусядзі.*** Жылі ў адной краіне, а сёння яны адвярнуліся ад нас. А вазьміце Украіну. Там заўсёды былі нашы людзі. Яны ж у такім цяжкім становішчы», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

«АСЦЯРОЖНЫ АПТЫМІЗМ»

Адна з медыкаў запытала ў Прэзідэнта, што ён укладае ў гэты выраз адносна каранавіруса?

Паводле Прэзідэнта, краіна забралася на плато бягучай хвалі кавіду. «Мы кожны дзень сталі «спаўзаць». Не «зніжацца», а менавіта спаўзаць. У выніку адбываецца зніжэнне тэмпаў захваральнасці. Так, людзі хварэюць, але тэмпы не тыя, што былі два-тры тыдні таму. ***Захваральнасць ёсць, мы спыніліся на высокім узроўні, але няма тэмпаў росту»***, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго інфармацыі, сярэднетыднёвы прырост новых выпадкаў кавіду знізіўся ў 1,5 раза за апошні тыдзень. Паменшылася колькасць людзей на ШВЛ. Расце колькасць пацыентаў з пнеўманіямі, што выпісваюцца са стацыянараў, а некаторыя медустановы вяртаюцца да аказання планавай меддапамогі. «Вось што выклікае асцярожны аптымізм. Я малю Бога кожную раніцу, каб не пагоршылася сітуацыя. Хопіць, наеліся гэтага залішне. Трэба ўжо, каб ён нас пашкадаваў», — дадаў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны, адказваючы на пытанне журналістаў, сказаў, што бачыць і недахопы ў лячэнні ад каранавіруса. На яго меркаванні, хворым людзям неабходна дыхаць свежым паветрам, па магчымасці гуляць на вуліцы.

«Я папярэдзіў міністра, што непарадак, калі ў бальніцы гарачыня, што дыхаць нельга. Калі і «чырвоная зона», не трымайце людзей у палатах. Хай, хто можа, выйдзе, паходзіць па калідоры. Ёсць жаданне дзесьці ўзяць бальніцу, людзей адзець цёпла і павадзіць па вуліцы. Паверце, у два разы хутчэй бы выздараўліваў чалавек ад каранавіруса», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА,
г. Ліда.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кантэкст

«ПАЖЫЛЫ ВАЙСКОВЕЦ УДАРЫЎ НЕКАЛЬКІ РАЗОЎ НАГОЙ У ЖЫВОТ»

Збітая польскімі сілавікамі жанчына страціла дзіця

На лініі беларуска-польскай граніцы 25 кастрычніка пагранічны нарад заўважыў групу бежанцаў, якія прасілі аб дапамозе. Сярод іх была жанчына ў цяжкім стане. Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце.

«Па словах яе сына, яны знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы і там запыталі статус бежанцаў. Замест разгляду прашэння польскія сілавікі пагрузілі іх у аўтамабіль і прывезлі на граніцу з Беларуссю. Бежанцам пагражалі і прымянялі фізічную сілу, каб прымусіць парушыць граніцу ў Беларусь. Пры гэтым цяжарную жанчыну некалькі разоў ударылі нагой у жывот. Як распавёў яе сын, гэта зрабіў на вачах у яе родных «пажылы польскі вайсковец з адной зоркай на пагонах». Ад гэтага ў жанчыны адкрыўся крывацёк», — распавялі ў ДПК. Толькі ўявіце сітуацыю! Нічога не нагадвае?

Брэсцкія пагранічнікі неадкладна выклікалі хуткую дапамогу, якая даставіла пацярпелую ў Камянецкую раённую бальніцу. Там жанчыну абследавалі і аказалі неабходную дапамогу. Цяпер яе стан ацэньваецца як сярэдняй ступені цяжкасці. На жаль, з прычыны атрыманых траўм жанчына страціла дзіця.

«Жорсткасць спараджае жорсткасць. Польскія пагранічнікі паказваюць кадры, як бежанцы ідуць праз загароды, а не стаяць, як раней, на лініі граніцы і не ўмольваюць даць ім магчымасць падаць прашэнне аб прыстанішчы, пры гэтым самі польскія ўлады спрабуюць дэманізаваць бежанцаў і стварацюць карцінку пра нібыта агрэсіўныя дзеянні іншаземцаў, аднак прычына зусім не ў бежанцах, якія страцілі надзею прасіць і чакаць. Збіваюць людзей, выкідваюць іх у лесе без ежы і адзення. Узнікае рытарычнае пытанне да краін ЕС: якіх адносін вы чакаеце? Дык, можа, зваротная рэакцыя бежанцаў на прыніжэнне з боку ЕС цалкам заканамерная?» — дадалі ў ведамстве.

Тое, што адбываецца ў Літве і Польшчы з мігрантамі, нагадвае запушчаны ў гэтых краінах механізм эскалацыі крызісу і глыбокай трансфармацыі ўлады. Такім меркаваннем з падпісчыкамі свайго тэлеграм-канала падзяліўся **палітолаг Юрый ШАЎЦОЎ,** паведаміла БелТА. «На граніцы спробы прарываў бежанцаў натоўпамі сталі нормай. Гляджу відэа: калі польскія пагранічнікі не перашкаджаюць, у бежанцаў паваліць агароджу з калючым дротам займае хвілін пяць. Можна і хутчэй. Трубы, на якія спіраль мацуецца, не забетаваны. Ці часта не забетанаваны, іх проста выдзіраюць з зямлі рукамі. Такой імітацыйнай барацьбы з мігрантамі наогул вельмі шмат. І вось гэта адкрытая імітацыйнасць барацьбы з міграцыйным крызісам і ёсць самае цікавае ў ім», — адзначыў эксперт. Ён дапускае, што гэта можа быць націскам на Германію і ўсю Старую Еўропу з боку Польшчы, Літвы і Латвіі. «Каб грошай далі. Там на коне толькі для Польшчы 24 мільярды еўра. Ці нешта ў Германіі і самім Бруселі. Дзейсныя ж меры для барацьбы з мігрантамі існуюць. Яны проста не запускаюцца», — канстатаваў Юрый Шаўцоў.

Каментуючы планы Польшчы па адпраўцы яшчэ 10 тысяч ваенных на барацьбу з бежанцамі плюс да пагранічнікаў і паліцыі, Юрый Шаўцоў называе гэта цэлай перадыслакацыяй войскаў непасрэдна да граніцы. «Гэта значыць, непасрэдна да Брэста і Гродна. Але наўрад ці гэта будзе само па сабе эфектыўным. Цяпер і так задзейнічана амаль 7 тыс. ваенных. Асаблівага толку ад іх, як бачым, паводле даных статыстыкі па бежанцах у Германіі, няма. Прарывы вялікімі групамі ідуць кожны дзень, ужо ёсць польскія параненыя. Калі на прарыў пойдуць натоўпы 1000—5000 чалавек, яны дадуць такую карцінку для СМІ, што ніякая армія палітыкам потым не дапаможа, — падкрэсліў палітолаг. — Пакуль усё, што адбываецца ў Літве і Польшчы з імігрыцыйным крызісам, нагадвае запушчаны ў гэтых краінах механізм эскалацыі крызісу і глыбокай трансфармацыі ўлады. Можа, размова ідзе аб пераварот, гэта значыць аб змене ўлады. А можа, і аб радыкальным узмацненні палітычнага рэжыму».

Таксама Юрый Шаўцоў не выключыў, што, калі афганскіх бежанцаў зімой стане шмат, яны абавязкова паспрабуюць асвоіць Украіну. «Афганцаў хопіць на ўсіх. Але Украіна асабліва не абаронена для ператварэння ў транзітную краіну з-за шэрагу асаблівых фактараў. У Польшчы відавочна стала на ногі буйная індустрыя трафіку людзей у Германію. Гэтай індустрыі ўсё роўна, адкуль ваціць бежанцаў праз Польшчу. Украіна мае вялікую граніцу з Польшчай — гэта натуральны канал для такой індустрыі. Прэцэдэнтаў такога транзіту становіцца ўсё больш. Прычым асабліва прыкметныя менавіта афганцы. Хутчэй за ўсё ёсць нейкі ўнутраны ўкраінскі фактар, чаму праз яе ідуць менавіта яны. Напярадзе ва Украіны складаная зіма. Калі не будзе энергіі і газу, структуры дзяржкіравання павінны будуць аслабець — самае тое для крымінальнага трафіку людзей», — рэзюмаваў аналітык.

Пётр ДУНЬКО.

ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ АГНЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Згубная звычка магла стаць фатальнай і для 18-гадовага хлопца з Віцебска. Паведамленне аб пажары ў прыватным сектары ратавальнікам паступіла ноччу. Як расказаў **начальнік змены Аляксандр ДУБІН,** калі яны прыбылі на месца, звонку дома ні дыма, ні агню не было відаць. «Каля хаты стаяў малады чалавек, ён сказаў, што ўнутры ёсць яшчэ адзін, — згадвае супрацоўнік МНС. — Мы з калегамі, падключыўшыся да апаратаў на сціснутым паветры, увайшлі ў хату. У адным з пакояў гарэла канапа, было шчыльнае задымленне, а на падлозе ў кухні мы ўбачылі чалавека. Ён быў у прытомнасці, аднак у неадэкватным стане: візуальна быў вельмі п'яны і выйсці з небяспечнай зоны самастойна не мог».

Да прыезду ўрачоў ратавальнікі аказалі маладому чалавеку першую медыцынскую дапамогу.

Супрацоўнікі МНС працуюць і на прафілактыку: тлумачаць людзям, як пазбегнуць пажару, а таксама як сябе паводзіць, калі адбылося здарэнне.

Печ патрабуе клопату

Амаль кожны трэці пажар сёння адбываецца з-за няспраўнасці і парушэння правілаў мантажу печаў, а таксама цеплагенеруючых агрэгатаў. Часта ўзгаранні становяцца вынікам няспраўных электрасетак і электраабсталявання, іх няправільнай эксплуатацыі.

Менавіта з-за апошняга адбыўся пажар на тэрыторыі аднаго з прыватных падворкаў у гарадскім пасёлку Крывічы, што ў Мядзельскім раёне. Агонь пашкодзіў сцяну гаража і маёмасць, якая ў ім знаходзілася. На шчасце, абышлося без пацярпелых.

Хэпі-эндам скончылася і ўзгаранне жылога дома ў вёсцы Каралёў Стан, якая знаходзіцца недалёка ад сталіцы. Калі ратавальнікі прыехалі на выклік, аданапавярховая драўляная хата гарэла адкрытым полымем. Гаспадар, які своечасова паспеў выйсці са свайго дома, атрымаў тэрмічныя апёкі. Па папярэдняй версіі, пажар адбыўся з-за парушэння правілаў эксплуатацыі печы.

— Ацяпляльны перыяд толькі пачаўся, але, на жаль, ужо фіксуюцца пажары, звязаныя з «рытуаламі» абагравання: дзесьці падводзіць своечасова неадрэмантаваная печ, у пэўных выпадках гаспадары вырашылі сагрэцца адзін раз, але так, што пераграванне не вытрымалі слабыя месцы, а хтосьці грэбуе правіламі выкарыстання адкрытага агню, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Пры эксплуатацыі пячнога ацяплення трэба быць надзвычай асцярожнымі. Неабходна выкарыстоўваць дровы, якія не выступаюць за межы апалавай камеры. Нельга распальваць печ вогненебяспечнымі і гаручымі вадкасцямі, паліць у ёй трэба два-тры разы на дзень з інтэрваламі, каб не дапусціць пераграванне. Печ не павінна мець расколін, комін у межах гарышча неабходна пабяліць. Завяршаць паленне трэба не пазней чым за дзве гадзіны да сну. Зачыніць засланку коміна можна толькі пераканаўшыся, што вугалле поўнасцю прагарэла.

Вераніка КАНЮТА.
Фота з архіва Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

Каб не дапусціць пажару падчас курэння, варта прытрымлівацца правілаў пажарнай бяспекі:

✓ нельга курыць у ложку, тым больш калі вы ў стане алкагольнага ап'янення;

✓ нават патушаныя цыгарэты нельга выкідваць з вокнаў або балконаў, а таксама ў вядро са смеццем, дзе ўжо знаходзяцца папера і іншыя гаручыя адходы;

✓ не варта ў якасці попельніцы выкарыстоўваць папяровыя скруткі, пачкі ад запалак або цыгарэт;

✓ сачыце за тым, каб запалкі або цыгарэты не траплялі ў рукі да малых дзяцей.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Нігерыя ўвяла ў абарачэнне ўласную лічбавую валюту

Яна стала першай краінай у Афрыцы, Цэнтральны банк якой выпусціў сваю «лічбу». Аб гэтым паведаміў прэзідэнт Нігерыі Мухамаду Бухары, абвясціўшы аб запуску і-найры (eNaira) — лічбавага аналага нацыянальнай валюты найры, паведаміла ТАСС. Ён падкрэсліў, што яе з'яўленне надасць новы імпульс не толькі нацыянальнай, але і ўсёй афрыканскай эканоміцы. Лічбавая найра не з'яўляецца крыптавалютай. Усе транзакцыі кантралююцца ўладамі, якія рэгулююць фінансавы рынак. Яе курс прывязаны да нацыянальнай валюты Нігерыі, таму яна не можа выкарыстоўвацца як спекуляцыйны інструмент. Як адзначае агенцтва France-Presse, рашэнне выпусціць лічбавую валюту выклікана жаданнем скараціць абарачэнне ў краіне «крыпты», транзакцыі якой не паддаюцца кантролю. Нігерыя займае трэцяе месца ў свеце па аб'ёме нацыянальнага крыптавалютнага рынку.

Больш за 1,7 млн нелегальных мігрантаў затрымана на граніцы ЗША з Мексікай

Колькасць бежанцаў, затрыманых на паўднёвай граніцы ЗША за мінулыя 12 месяцаў, пабіла рэкорд 20-гадовай даўнасці, калі граніцу спрабавала нелегальна перасекчы больш як 1,6 мільёна чалавек. Трапіць у Штаты спрабавалі грамадзяне звыш 160 краін. Большасць мігрантаў прыйшла з Мексікі, Гватэмалы, Гандураса і Сальвадора. У асноўным гэта людзі сярэдняга ўзросту — больш за 1,1 млн чалавек. Пры гэтым, паводле даных амерыканскіх улад, граніцу спрабавала перасекчы рэкордная колькасць дзяцей без суправаджэння дарослых — больш за 145 тыс. Як паведамляе пагранічна-мытная служба ЗША, больш за палову затрыманых было дэпартавана назад у свае краіны.

Мінулы год стаў самым гарачым у Азіі за ўвесь час назіранняў

Пры гэтым высокія тэмпературы спрыялі стыхійным бедствам і сур'ёзным эканамічным стратам, паведаміла The Guardian са спасылкай на даклад Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) ААН. «Катаклізмы надвор'я і кліматычныя змены ў Азіі ў 2020 годзе сталі прычынай гібелі тысяч людзей, прывялі да таго, што мільёны людзей пакінулі свае дамы. Яны абышліся ў мільярды долараў страт за кошт моцнага ўрону інфраструктуры і экасістэмам», — адзначаецца ў дакладзе. Паводле даных СМА, зафіксаваныя летась тэмпературы апынуліся вышэйшыя на 1,39 градуса па Цэльсіі ў параўнанні з паказчыкамі 1981—2010 гадоў. У абсалютных паказчыках найбольшыя эканамічныя страты панёс Кітай — $238 млрд, за ім — Індыя з $87 млрд, Японія з $83 млрд і Паўднёвая Карэя з $24 млрд. А з улікам памеру эканомік больш за ўсё пацярпелі Таджыкістан, страты якога, як чакаецца, склалі 7,9 % ад ВУП, Камбоджа — з 5,9 % і Лаос — з 5,8 %.

Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае спачуванні кансультанту ўпраўлення эканомікі і фінансаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Трасцянку Леаніду Здзіслававічу ў сувязі са смерцю БАЦЬКІ.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 7 (61)

Афіцыйна

Стратэгія для прыроды

Мінпрыроды праводзіць грамадскія абмеркаванні экалагічнага даклада па стратэгічнай экалагічнай ацэнцы праекта Стратэгіі ў сферы аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2035 года

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Дата паведамлення:

27 кастрычніка 2021 года.

Інфармацыя аб дзяржаўным органе, які плануе распрацоўку дакументацыі:

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, 220004, г. Мінск, вул. Калектарная, 10, e-mail: mail@minpriroda.gov.by, тэлефон прыёмнай (+37517) 200-66-91, тэлефон канцылярыі (+37517) 200-68-44, факс (+37517) 200-55-83.

Найменне дакумента планавання, для якога праводзіцца стратэгічная экалагічная ацэнка, апісанне:

стратэгічная экалагічная ацэнка (далей — СЭА) праводзіцца па праекце Стратэгіі ў сферы аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2035 года (далей — праект Стратэгіі).

Размяшчэнне паведамлення ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі главы 4 Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення грамадскіх абмеркаванняў праектаў экалагічна значных рашэнняў, экалагічных дакладаў па стратэгічнай экалагічнай ацэнцы, справаздач аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, уліку прынятых экалагічна значных рашэнняў, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2016 г. № 458.

Распрацоўка праекта Стратэгіі абумоўлена неабходнасцю ўдасканалення кіравання навакольным асяроддзем, павышэння яго эфектыўнасці для забеспячэння нацыянальных экалагічных інтарэсаў у працэсе ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на перыяд да 2035 года.

Праект Стратэгіі дапаўняе дзеючыя дакументы прыродаахоўнага планавання і прагназавання за кошт вызначэння стратэгічных арыенціраў дзяржаўнай экалагічнай палітыкі і паслужыць асновай яе арганізацыі на перспектыву.

Інфармацыя аб прымаемым рашэнні ў адносінах да дакумента планавання і дзяржаўным органе, адказным за прыняцце такога рашэння:

зацвярджэнне праекта Стратэгіі будзе ажыццёўлена шляхам прыняцця рашэння калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.

Орган, адказны за прыняцце такога рашэння: Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.

Тэрміны правядзення грамадскіх абмеркаванняў:

грамадскія абмеркаванні праводзяцца з 27 кастрычніка 2021 г. да 27 лістапада 2021 г.

Тэрміны і парадак накіравання заўваг і прапаноў па экалагічным дакладзе па СЭА:

у перыяд з 27 кастрычніка 2021 г. да 27 лістапада 2021 г. заўвагі і прапановы па экалагічным дакладзе па СЭА па праекце Стратэгіі накіроўваць на адрас Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь: 220004, г. Мінск, вул. Калектарная, 10, e-mail: mail@minpriroda.gov.by з пазнакай «Грамадскія абмеркаванні».

Інфармацыя пра тое, дзе можна азнаёміцца з экалагічным дакладам па СЭА і куды неабходна накіроўваць заўвагі і прапановы:

экалагічны даклад па СЭА па праекце Стратэгіі размешчаны на сайце Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь па адрасе: https://minpriroda.gov.by/ru/ob_obsuzd_ru/ у раздзеле «Грамадскія абмеркаванні».

Папяровы варыянт экалагічнага даклада па СЭА па праекце Стратэгіі знаходзіцца па адрасе Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь: 220004, г. Мінск, вул. Калектарная, 10, хол, 1-ы паверх.

Кантактная асоба па экалагічным дакладзе па СЭА па праекце Стратэгіі — кансультант упраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Каліновік Марына Міхайлаўна. Тэлефон/факс (+37517) 200-42-84, e-mail: an_work@minpriroda.gov.by.

Заўвагі і прапановы па экалагічным дакладзе па СЭА па праекце Стратэгіі накіроўваць на адрас Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь: 220004, г. Мінск, вул. Калектарная, 10, e-mail: mail@minpriroda.gov.by з пазнакай «Грамадскія абмеркаванні».

Тэрміны і парадак накіравання заявы аб неабходнасці правядзення сходу па абмеркаванні экалагічнага даклада па СЭА:

падача заявы аб неабходнасці правядзення сходу па абмеркаванні экалагічнага даклада па СЭА па праекце Стратэгіі ажыццяўляецца ў тэрмін з **27 кастрычніка 2021 г. да 9 лістапада 2021 г.** па адрасе: Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, 220004, г. Мінск, вул. Калектарная, 10, e-mail: mail@minpriroda.gov.by ці адпаведных абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў.

Актуальнае пытанне

«Будучыня — за «зялёнай» эканомікай»

Баляслаў ПІРШТУК:

З кожным днём на нашых дарогах усё больш электратранспарту, не ў навіну сонечныя батарэі нават у прыватных дамах, даўно папулярны шэрынг. Ці можна сёння гаварыць пра тое, што «зялёная» эканоміка — ужо не модны трэнд, а практычнае ўвасабленне найлепшых практык? Пра гэта распавёў Баляслаў ПІРШТУК, першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Фота прэс-службы Мінпрыроды.

— У сувязі з глабальнай зменай клімату ўвесь свет занепакоены павелічэннем выкідаў парніковых газаў. Як на агульным фоне выглядае Беларусь?

— Большасць краін свету, практычна ўсе краіны Еўрасаюза прымаюць на сябе новыя абавязацельствы па скарачэнні выкідаў парніковых газаў і дасягненні вугляроднай нейтральнасці. Напрыклад, у Швецыі прыярытэтнымі напрамкамі з'яўляюцца кіраванне адходамі, уключаючы ўпакоўку, развіццё аднаўляльных крыніц энергіі з давядзеннем іх долі ў вытворчасці энергіі да 100 % да 2040 года. У Фінляндыі даследуюцца пытанні пераходу да біяэканомікі, развіцця «зялёных» фінансаў. У Германіі ключавымі напрамкамі дасягнення «зялёнага» росту вызначаны ўстойлівыя вытворчасць і спажыванне, рэсурсаэфектыўнасць і ўстойлівы турызм. Стратэгічнай мэтай Кітая, Казахстана з'яўляецца дасягненне вугляроднай нейтральнасці да 2060 года.

Наша краіна адказвае за 0,19 % выкідаў парніковых газаў у сусветным маштабе. У Беларусі плануецца іх скарачэнне на 35 % да 2030 года ў параўнанні з узроўнем 1990 года.

— У нашай краіне створана сучасная заканадаўчая база для развіцця «зялёнай» эканомікі. Што можна сказаць аб практычным увасабленні закладзеных у ёй нормаў?

— Паспяхова рэалізоўваецца Праграма стварэння дзяржаўнай зарадной сеткі для зарадкі электрамабіляў. У 2018 годзе ў нас было 85 такіх станцый, да канца гэтага года чакаецца 600. Нядзіўна, што адбыўся рэзкі скачок колькасці электратранспарту. Яна павялічылася больш чым у 40 разоў у параўнанні з 2017 годам і дасягнула 4 тыс. адзінак.

Мінпрыроды сумесна з РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» і Праграмай развіцця ААН распрацавана і знаходзіцца на стадыі ўзгаднення праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі Глабальнага экалагічнага фонду «Зніжэнне бар'ераў для развіцця электрамабільнасці ў Рэспубліцы Беларусь шляхам стварэння сеткі суперхуткіх зарадных станцый».

Меркаваны тэрмін рэалізацыі праекта — 2022—2026 гады. Ён будзе спрыяць павышэнню даступнасці электрамабіляў для насельніцтва.

Развіваецца шэрынгавая эканоміка, гэта значыць сумеснае выкарыстанне аўтамабіляў і электрамабіляў, роварaў, самакатаў і іншых мабільных сродкаў.

— Часта кажуць, што наяўнасць Беларускай АЭС не з'яўляецца перашкодай для развіцця аднаўляльнай энергетыкі...

— Гэта насамрэч так. Наша краіна валодае дастатковым патэнцыялам у сферы аднаўляльнай энергетыкі. Найбольш традыцыйным відам аднаўляльных крыніц энергіі ў Беларусі з'яўляецца драўнянае паліва, перспектыўнае выкарыстанне энергіі ветру і сонца. За тры гады доля вытворчасці элекраэнергіі за кошт выкарыстання АКЭ ўзрасла больш чым у два разы.

У рамках развіцця «зялёнага» будаўніцтва асноўны акцэнт зроблены на выкарыстанні энергазберагальных рашэнняў, тэхналогій «разумнага дому», уключаючы будаўніцтва электрадамоў.

— Якія прыярытэтныя напрамкі развіцця «зялёнай» эканомікі ў нашай краіне?

— Мінпрыроды сумесна з 48 зацікаўленымі дзяржорганамі і арганізацыямі распрацаваны праект Нацыянальнага плана дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі ў нашай краіне да 2025 года. Што прапануецца? Перш за ўсё, укараненне прынцыпаў устойлівага спажывання і вытворчасці; фарміраванне «разумных» і энергаэфектыўных гарадоў. Неабходна развіваць эканоміку замкнёнага цыкла, арганічную сельскую гаспадарку і экалагічны турызм, электратранспарт і гарадскую мабільнасць. Больш падрабязна спынюся на тэме «зялёнага» фінансавання, то-бок інвестыцый, ільготнага крэдытавання, субсідый, накіраваных на рэалізацыю экалагічна чыстых, энергаэфектыўных і нізкавугляродных праектаў. Першарадным застаецца пытанне змякчэння наступстваў змены клімату і адаптацыі да кліматычных змен, а таксама захаванне і ўстойлівае выкарыстанне біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці. Уся гэтая работа грунтуецца на навуковым забеспячэнні пераходу да «зялёнай» эканомікі. Бачу неабходнасць і ў папулярызацыі дадзенай тэмы сярод насельніцтва, таму што, несумненна, будучыня — за «зялёнай» эканомікай.

Фота Ігара САКА.

— Баляслаў Казіміравіч, ці гатовая наша краіна да трансгранічнага вугляроднага падатку, які ўводзіць Еўрасаюз?

— Увядзенне Еўрапейскім саюзам гэтага падатку закране эканамічныя інтарэсы ўсіх краін-экспарцёраў, у тым ліку Беларусі. Паводле інфармацыі Мінэканомікі, страты нашых экспарцёраў складуць прыкладна 96 млн еўра ў год (пры цане звыш 50 еўра за тону CO_2). Асноўны ўдар прыйдзецца на энергаёмістыя сектары прамысловасці, такія як вытворчасць жалеза, сталі, алюмінію, цэменту, угнаенняў і электраэнергіі.

Мінпрыроды сумесна з зацікаўленымі ведамствамі распрацаваны план мерапрыемстваў па мінімізацыі рызык для эканомікі Беларусі, звязаных з планаваным укараненнем ЕС трансгранічнага вугляроднага рэгулявання.

Вядзецца сістэмная работа па падрыхтоўцы Стратэгіі доўгатэрміновага развіцця Беларусі з нізкім узроўнем парніковых газаў да 2050 года. У ёй прагледжаны адпаведныя меры ў сферах выпрацоўкі цеплавой і электраэнергіі, павышэння энергаэфектыўнасці ў прамысловым, транспартным, будаўнічым і жыллёва-камунальным сектарах. У любым выпадку, неабходна працаваць у напрамку зніжэння вугляродаёмістасці эканомікі.

— Развіццё «зялёнай» эканомікі цесна звязанае з мінімізацыяй наступстваў змены клімату і скарачэння выкідаў парніковых газаў. У гэтай сувязі можна гаварыць і аб захаванні біяразнастайнасці?

— У Беларусі адзін з самых высокіх паказчыкаў лясістасці ў Еўропе — каля 40 %. Як вядома, лес паглынае парніковыя газы. У найбліжэйшай будучыні плануецца павелічэнне плошчы лясного фонду. Плошчы неасушаных балот складаюць каля 7 %, ці 863 тысячы га ад усёй тэрыторыі Беларусі. Прадзіцца планамерная работа па паўторным забалочванні, аднаўленні тарфянікаў, што спрыяе скарачэнню выкідаў дыяксіду вугляроду.

За папярэднюю пяцігодку рэалізаваны праекты ў галіне аднаўлення асушаных тарфянікаў на плошчы 64 тысячы га, праведзены эфектыўныя мерапрыемствы па захаванні ландшафтнай і біялагічнай разнастайнасці.

— «Зялёная» эканоміка — гэта ж не толькі пра экалогію?

— Менавіта так. «Зялёная» эканоміка — гэта стратэгія для вырашэння многіх праблем як экалагічных, так эканамічных і сацыяльных. Перш за ўсё, гэта экалагічная бяспека, устойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў. «Зялёная» эканоміка спрыяе занятасці насельніцтва і канкурэнтаздольнасці нашых тавараў на сусветных рынках. Дзякуючы ёй забяспечваецца паэтапны сістэмны падыход па дасягненні нашай краінай Мэт устойлівага развіцця. У выніку гэта дазволіць палепшыць якасць жыцця людзей, зберагчы і прымножыць прыродныя багацці Беларусі.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

Небяспечныя адходы

Пестыцыды — на знішчэнне

Іх пакуюць, вывозяць з Беларусі і спальваюць на спецыяльных заводах

Вясной 2022-га Віцебская і Гродзенская вобласці павінны цалкам вызваліцца ад 920 тон непрыдатных пестыцыдаў, якія за дзесяцігоддзі работы ўтварыліся на айчынных сельгаспрадпрыемствах. Налета таксама возьмуцца і за ачыстку ад 500 тон пестыцыдаў Міншчыны. Небяспечную спадчыну пакрысе вывозіць на знішчэнне ў Германію польская кампанія Geocoma («Геакома»). На адгрузцы адной з такіх партый пабывала карэспандэнт «Звязды».

Ядавітыя бочкі

Усяго ў краіне з часоў СССР засталося звыш 10 тысяч тон пестыцыдаў, у тым ліку **стойкіх арганічных забруджвальнікаў (САЗ).** У 17 раёнах Віцебскай вобласці на складах, самы вялікі з якіх — «Дзёрнавічы» на Полаччыне, назбіралася каля 800 тон ядахімікатаў. Пяць раёнаў (Дубровенскі, Аршанскі, Сенненскі, Браслаўскі, Шаркаўшчынскі) ужо пазбавіліся ад небяспечнага пестыцыднага грузу. А на Гродзеншчыне 120 тон небяспечнага прадукту ўжо звезены ў адзін склад пад Навагрудкам. Яны перапакаваныя і чакаюць вывазу ў 2022 годзе.

Польская кампанія Geocoma («Геакома») працуе ў Беларусі паводле дагавора з Мінпрыроды па экалагічна бяспечным знішчэнні непрыдатных пестыцыдаў. Небяспечныя рэчывы вывозяцца на знішчэнне ў межах праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Устойлівае кіраванне стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і хімічнымі рэчывамі ў Рэспубліцы Беларусь, ГЭФ-6». Ён рэалізуецца ў краіне Мінпрыроды сумесна з Праграмай развіцця ААН у Беларусі, адзначыў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ:**

— Дзякуючы праекту мяркуецца вырашыць праблему непрыдатных пестыцыдаў, якія захоўваюцца на складах сельгасарганізацый. Адходы будуць знішчаны экалагічна бяспечным спосабам — высокатэмпературным спальваннем.

Спецыялісты кампаніі пераўпакоўваюць, узважваюць і вывозяць пестыцыды на перапрацоўку ў Германію. На ўсіх гэтых этапах супрацоўнікам дапамагае служба МНС тых рэгіёнаў, дзе знаходзяцца склады пестыцыдаў.

Першыя дзве машыны па прыкладна 20 тон небяспечных адходаў з Віцебскай птушкафабрыкі, Дуброўна, Оршы, Лепеля, Талачына паехалі ў Германію яшчэ ў верасні. Каля 18 тон, запакаваных у чарговую фуру, што адправілася ў шлях у кастрычніку, якраз і давялося ўбачыць. Гэта бочкі з непрыдатнымі ядахімікатамі са склада прадпрыемства «Шаркаўшчынскі агратэхсэрвіс».

— Сваіх тут было 11 тон небяспечнага прадукту, да якога дадалі папярэдне прывезеныя пестыцыды з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Глыбоцкага раёна: «Мнюта», «Ламашы-Агра», «Глыбоцкі аграсэрвіс». А ў наступнай машыне, мяркуецца, паедуць пестыцыды з вялікага склада ў Дзярновічах, — расказала **Дзіяна ПАРУБІН, асістэнт кіраўніка кампаніі Geocoma,** якая адказвае за хімічны аналіз пестыцыдаў.

Прывёз — праверыў — спаліў

Планавалася, што пестыцыды з Беларусі будуць знішчаць на пяці нямецкіх заводах: Currenta, Remondis SAVA, AVG, HIM і SUEZ. Аднак пакуль адходы адпраўляюцца толькі на два: AVG і Remondis SAVA. Хоць спецыялісты Geocoma спадзяюцца неўзабаве атрымаць дазволы на вываз яшчэ на два прадпрыемствы: SUEZ і HIM — тады і работа пойдзе ўдвая хутчэй, падзяліўся **Яраслаў СУРМА, праектны дырэктар польскай кампаніі Geocoma:**

— Для нас самае важнае — арганізаваць бяспечны правоз грузу і яго спальванне, а таксама вызваліць запланаваныя плошчы. Перад упакоўкай мы робім свой аналіз адходаў, аднак у Германіі перад утылізацыяй змесціва бочак таксама бярэцца на аналіз. І пратаколы першых тэстаў на спальванне ад папярэдняй фуры (якая з'ехала яшчэ ў верасні) таксама неўзабаве атрымаем — і згодна з імі зможам планаваць графік далейшай работы па абодвух заводах. Плануем адпраўляць дзве машыны на тыдзень.

Нямецкія прадпрыемствы скіраваны на аператыўную работу па прынцыпе «прывёз — праверыў — спаліў» і не зацікаўленыя складзіраваць небяспечныя пестыцыды на сваіх плошчах. Максімум — адзін-два тыдні, і іх спальваюць. Супрацоўнікі Geocoma мяркуюць, што далей справа пойдзе хутчэй, бо нямецкія эксперты ўжо будуць ведаць прыкладны састаў беларускіх пестыцыдаў і будуць падрыхтаваныя. Тым не менш, польскія спецыялісты заўважылі, што работа замаруджваецца доўгім працэсам сертыфікацыі і атрыманнем дазволаў.

Напакаваная ядавітымі бочкамі фура рушыла за мяжу, а ў Шаркаўшчыне засталіся тры пустыя склады з-пад пестыцыдаў. Іх далейшы лёс — хутчэй за ўсё, таксама быць знішчанымі, як і тое, што яны захоўвалі дзесяцігоддзямі.

Планы на заўтра

Частка пестыцыдаў захоўваецца таксама ў пяці падземных сховішчах Беларусі, тры з якіх — у Пастовах, Верхнядзвінску і Гарадку — знаходзяцца ў Віцебскай вобласці.

— У рамках праекта адбываецца франтальнае даследаванне дадзеных сховішчаў, у выніку чаго будзе складзены план па ліквідацыі гэтых адходаў з разлікам фінансавых затрат, — заўважыў **Дзяніс КАВАЛЕНКА, кіраўнік праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Устойлівае кіраванне стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і хімічнымі рэчывамі ў Рэспубліцы Беларусь, ГЭФ-6».** *— Найбольшую небяспеку для навакольля выклікаюць менавіта паверхневыя склады, вывазам пестыцыдаў з якіх цяпер займаюцца, таму з іх і пачалі.*

Акрамя Віцебшчыны і Гродзеншчыны, пестыцыды застаюцца яшчэ на Міншчыне, Магілёўшчыне і на Гомельшчыне. Апошні склад у Чачэрскім раёне — гэта арганізаванае сховішча на пяць тысяч тон, якія будуць знішчацца ў Беларусі пасля будаўніцтва спецыялізаванага аб'екта.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Экалогія і закон

ЯК ДАПАМАГЧЫ ЖЫВЁЛІНАМ?

Змяненні ў заканадаўства аб жывёльным свеце накіраваны на паляпшэнне ўмоў іх жыцця побач з чалавекам

У пачатку кастрычніка на пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу адбылося першае чытанне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях жывёльнага свету і бяспекі генна-інжынернай дзейнасці». Падрабязнасці дакумента раскрыла кансультант аддзела біялагічнай разнастайнасці галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Таццяна ЖАЛЯЗНОВА, якая адзначыла, што ў закон «Аб жывёльным свеце» ўносяцца тры важныя змяненні.

ДРАПЕЖНІКІ ПАД ЗАБАРОНАЙ

Будзе ўстаноўлены пералік жывёлін, забароненых да ўтрымання ў дамашніх умовах. З 2007 года ў краіне практыкуецца рэгістрацыя дзікіх жывёлін, якія ўтрымліваюцца ў няволі. Існуе некалькі такіх катэгорый жывёлін, якія могуць жыць дома ў грамадзян. Гэта знікаючыя, экзатычныя віды, якія трапляюць пад дзеянне Канвенцыі СІТЭС, — яны рэгіструюцца ў Мінпрыроды. Таксама прыродаахоўнае ведамства рэгіструе віды, уключаныя ў Чырвоную кнігу Беларусі. А з 2015—2016 гадоў — і прадстаўнікоў усіх відаў дзікіх жывёлін, якія жывуць на тэрыторыі краіны ў натуральным асяроддзі. Рэгістрацыяй апошняй катэгорыі займаюцца абласныя камітэты прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

— Як паказвае практыка, у асноўным у нас утрымліваюць у дамашніх умовах чарапах, птушак, змей, — кажа Таццяна Жалязнова. — Таксама ў Беларусі быў выпадак утрымання ў аднапакаёвай кватэры львяняці. І на той момант не было механізмаў, якія дазвалялі б забараніць гэта рабіць. Аднак цяпер у краіне ўстаноўлены нормы і патрабаванні ўтрымання дзікіх жывёлін. Калі яны не выконваюцца, то жывёліна не рэгіструецца, накладаюцца пэўныя штрафныя санкцыі на грамадзяніна або юрыдычную асобу — яе ўладальніка.

Па словах спецыяліста, надышоў час устанавіць пералік дзікіх жывёлін, якіх нельга будзе ўтрымліваць у няволі. Гэты спіс будзе распрацоўвацца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. Туды ўвойдуць усе ядавітыя змеі, буйныя драпежныя жывёліны, небяспечныя птушкі, ядавітыя насякомыя і г. д. Інакш кажучы, усе віды, якія могуць ствараць пагрозу здароўю і жыццю грамадзян.

ЗААПАРК — БЕЗ КАНТАКТУ

Таксама ў праекце закона ўстаноўлены пералік жывёлін, якія дазволена ўтрымліваць у кантактных заапарках. У асноўным раней там можна было сустрэць сельскагаспадарчых і свойскіх жывёл: курэй, свіней, коз. Апошнім часам у кантактных заапарках сталі ўтрымліваць янотаў, ліс і іншых жывёлін, якія трапляюць пад катэгорыю дзікіх.

— Мы катэгарычна супраць такога ўтрымання, таму што дзікая жывёліна заўсёды будзе дзікай, яна стварае пагрозу для чалавека, прадбачыць яе паводзіны немагчыма, — кажа спецыяліст Мінпрыроды. — Акрамя таго, гэта велізарны стрэс для самой жывёліны. Гэта не кошка і не сабака, якія тысячы гадоў жылі побач з людзьмі і прывыклі да нашых паводзінскіх асаблівасцяў, адаптаваліся да сумеснага пражывання.

У пералік дазволеных да ўтрымання жывёлін увойдуць грызуны, невялікія жывёліны, якія не адчуваюць асаблівага дыскамфорту пры кантакце з чалавекам і не пагражаюць яго жыццю і здароўю.

У ПЕРАСОЎНЫХ ЗВЯРЫНЦАЎ ШАНЦАЎ НЯМА?

Уносяцца ў закон і змяненні, якія датычацца дзейнасці перасоўных звярынцаў. Вырашана было цалкам забараніць іх на нашай тэрыторыі. Па словах Таццяны Жалязновай, вывучыўшы вопыт іншых краін і ўласны, звязаны з дзейнасцю перасоўных звярынцаў, спецыялісты зразумелі, што нармальнае ўтрыманне жывёлін на такіх перасоўных платформах немагчымае. Бо іх нельга павялічыць, стварыць там дадатковыя памяшканні. У выніку жывёліна з нараджэння знаходзіцца ў зняволенні, а ўмовы яе ўтрымання не адпавядаюць патрабаванням, якія ўстаноўлены беларускім заканадаўствам і якія падыходзяць для відавых асаблівасцяў. Жывёліна не можа ні схавацца, ні паесці нармальна, яе нельга вывесці гуляць — так праходзіць усё яе жыццё.

— Гэта жорсткае абыходжанне з жывёлінамі, таму мы катэгарычна супраць дзейнасці перасоўных звярынцаў і выходзім з ініцыятывай аб забароне дзейнасці такіх арганізацый, — падсумавала кансультант Мінпрыроды.

БЕЗ ШТАМАЎ

Новаўвядзенні ў закон «Аб бяспецы генна-інжынернай дзейнасці» будуць не такія глабальныя, як у закон «Аб жывёльным свеце». Апошняе звязана з тым, што нядаўна дадзены дакумент праглядаўся комплексна, засталося адно пытанне. Сёння рэгістрацыі падлягаюць пароды генна-інжынерных жывёл, сарты генна-інжынерных раслін і штамы генна-інжынерных мікраарганізмаў.

— Па вялікім рахунку, калі мы ствараем нейкі новы генна-інжынерны механізм, мы не ствараем нешта прынцыпова новае, уносяцца пэўныя карэкціроўкі, якія паляпшаюць якасць гэтага сорту, пароды або штама, — тлумачыць спецыяліст. — У выніку няма новай пароды, новага сорту і новага штама. Таму мы выключаем з тэрмінаў гэтыя назвы: «штам», «парода», «сорт» і пакідаем толькі «жывёлін», «расліна» і «мікраарганізмы».

Па словах Таццяны Жалязновай, дабрабыт дзікіх жывёлін — актуальнае пытанне, таму яна спадзяецца, што прыведзеныя новаўвядзенні прымуць.

Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517) с дополнением от 10.08.2021 № 151 (29520), от 02.10.2021 № 190 (29559)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00-14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517), следующие дополнения:

Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:

- 3 (три) трехкомнатные квартиры общей площадью по проекту от 70,6 до 91,4 кв. метра на втором этаже. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1400 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленный договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1450 долларам США;

- 3 (три) однокомнатные квартиры общей площадью по проекту от 53,1 до 81,5 кв. метра на десятом этаже. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1700 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленный договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1800 долларам США;

- 1 (одна) трехкомнатная квартира № 68 (проектный) общей площадью по проекту 86,4 кв. метра на 9-м этаже 2-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1450 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленный договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1500 долларам США;

- 1 (одна) трехкомнатная квартира № 80 (проектный) общей площадью по проекту 91,4 кв. метра на 3-м этаже 3-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1400 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленный договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1450 долларам США;

- 1 (одна) однокомнатная квартира № 168 (проектный) общей площадью по проекту 36,9 кв. метра на 7-м этаже 4-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1550 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1600 долларам США;

- 1 (одна) однокомнатная квартира № 177 (проектный) общей площадью по проекту 49,5 кв. метра на 9-м этаже 4-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1550 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1600 долларам США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляются не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с представлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайтах: sit.by, gastello.by.

26 ноября 2021 года

состоятся торги в форме открытого аукциона по продаже недвижимого имущества Общества с ограниченной ответственностью «ОКНОГРАД»

Наименование	Продажная стоимость, без НДС, бел. руб.
1. Капитальное строение (здание материального склада) инвентарный номер 630/С-66966 площадью 152,20 кв. м, расположенное по адресу: г. Молодечно, ул. Рабочая, 1/5	10 700,00
2. Капитальное строение (здание цеха по изготовлению стеклопакетов) с инвентарным номером 630/С-66965, площадью 689,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Молодечно, ул. Рабочая, 1/3	165 400,00
3. Капитальное строение (здание склада № 1) с инвентарным номером 630/С-66963, площадью 98,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Молодечно, ул. Рабочая, 1/2	31 100,00
4. Капитальное строение (здание административно-производственное) с инвентарным номером 630/С-66962, площадью 2121,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Молодечно, ул. Рабочая, 1/1	448 700,00

Сведения об имуществе:

Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623850100003002401, площадью 1,0280 га (право аренды). Отдельный участок под отдельные строения не выделен.

Ипотека. Запрет отчуждения и совершения определенных действий судебного исполнителя.

Аукцион будет проводиться 26.11.2021 г. в 12.00 по адресу: 222310, Республика Беларусь, Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, дом 1, офис 8 (место нахождения имущества).

Организатор аукциона – Ликвидационная комиссия ООО «ОКНОГРАД».

Дополнительную информацию об условиях аукциона можно получить по телефону +375293478964, по электронной почте **siabrov@mail.ru.**

Срок подачи заявлений на участие – по 25.11.2021 г.

Также 12.11.2021 г. состоятся повторные торги в форме открытого аукциона по продаже движимого имущества ООО «ОКНОГРАД»

Наименование	Продажная стоимость, без НДС, бел. руб.
Метал. рольганговый стеллаж для тр. к. стеклопакетов	7 782,88
Монтажный стол б/у Lisec модель УК 140 год 2000	2 335,13
Пила STB модель SD 15E- FM	2 240,64
Присоска для загрузки стекла на стол Pannkoke	6 310,38
Рама для разгрузки стекла Pannkoke	1 875,33
Ручной станок для производства стеклопакетов BUXTR	15 337,38
Стол для порезки стекла Boltero BCS 352 LMT/J	19 382,39
Установка компрессорная СБ4/С100, LB51	991,98
Установка компрессорная СБ4/Ф500, ТС2095	4 692,38
Углошлифмашина одноручная GWS 850 CE 850 Вт 125 мм	135,94
Пирамида	740,11
Пирамида 3,5х 1,7х1,8	463,12
Пирамида 3,5х 1,7х1,9	463,12
Пирамида № 2	937,40
Автомат. одноголовый сварочный станок OMRM 102A	5 031,05
Двухголовочная пила HAFFNER модель DGS 187	10 326,34
Зачистной станок STB модель WP-OF 1/F	791,94
Зачистной станок STB модель WP-OF 1/F	1 124,24
Копировально-фрезерный станок для фрез. вод. OMRM 108	2 782,04
Копировально-фрезерный станок STB модель F-101	576,16
Копировально-фрезерный станок STB модель F-130	710,25
Пила STB модель SD15E-F	1 278,46
Пила для резки штапика STB модель GS 225 M	1 548,21
Полуавтоматический трехфрезерный станок для фрезерования отверстий	4 171,62
Ручной станок для обработки торца импоста OMRM111	1 016,38
Склад для фурнитуры URBAN	3 152,03
Стенд остекления URBAN	2 034,32
Стол монтажа фурнитуры RYKO, модель MST 2424P	1 580,03
Стружкоотсос, мод. MF9025	545,76
Углозачистной станок URBAN для обработки ПВХ профилей	1 526,58
Углозачистной станок URBAN	4 287,55
Углошлифмашина одноручная GWS 850CE/850B, 125 мм	122,35
Шуруповерт GEVO	3 335,11
Четырехголовый сварочный станок ACTUAL A4 V4030	18 375,1
Двухголовая ПВХ сварочная машина WEGOMA	3 566,16
Импостовый станок STB модель F-125	866,11
Механический копировально-фрезерный станок для фрез. отв.	3 875,62
Пила для резки металла MACC, модель TRS 250	1 150,97
Штабелер ручной/арт PA1516/код 22716	1 441
Штабелер ручной/арт PA1516/код 22717	1 441
Ресивер РВ500.11.00 с арматурой	534,73
Отопительный котел МИР-95 в комплекте	2 843,80
Установка компрессорная СБ4/СМ-100LB50	910,74
Установка компрессорная СБ4/Ф-270.LB52	1 332,97
Стол монтажа фурнитуры URBAN	3 420,92
Автомат. станок для резки штапика (4ht; l) СЛН-501	1 686,79
Ленточнопильный станок MG6200	3 770,00
Индустриальный пылесос S38 L100FM4010500041	2 662,89
Кондиционер Ballu BSG-12HG N1	2 027,36
Автомобиль Peugeot 508 кузов VF30D5FEACL032390, 2012 год выпуска	19 000,00
Автомобиль Peugeot 508 кузов VF30D5FEACL036848, 2012 год выпуска	16 000,00

Аукцион будет проводиться 12.11.2021 г. в 12.00, по адресу: 222310, Республика Беларусь, Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, дом 1, офис 8 (место нахождения имущества).

Организатор аукциона – Ликвидационная комиссия ООО «ОКНОГРАД».

Дополнительную информацию об условиях аукциона можно получить по телефону **+375293478964, по электронной почте** siabrov@mail.ru.

Срок подачи заявлений на участие – по 11.11.2021 г.

Реквизиты для перечисления задатка (5 % от стоимости имущества): Общество с ограниченной ответственностью «ОКНОГРАД»

IBAN: BY34OLMP30121000432070000933
ОАО «Белгазпромбанк» ЦБУ № 501
г. Молодечно, ул. В. Гостинец, д. 143Б
BIC-ISO: OLMPBY2X

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, тел. + 375 29 688-04-88**

Предмет повторного аукциона, назначенного на 15.11.2021

Лот № 1

Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, 33**

Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц: ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копировальные аппараты, пожарная сигнализация, источники бесперебойного питания, компьютерная сеть, система симметричной связи, счетно-денежн. машинки, мебель, кабельная телефонная линия, системы вентиляции и кондиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**)

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 128 681,28 бел. руб.
(снижена на 40 %)
Шаг аукциона – 6 434,06 бел. руб.

Лот № 2

Местоположение **– г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Помещение санитарно-бытового назначения	1,7 кв. м	500/D-7028275

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 3 108,00 бел. руб.
(снижена на 40 %)
Шаг аукциона – 155,40 бел. руб.

Лот № 3

Местоположение – г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Административно-торговое помещение	733,5 кв. м	500/D-7023833

Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 2 088 720,00 бел. руб.
(снижена на 20 %)
Шаг аукциона – 104 436,00 бел. руб.

Лот № 4

Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а**

Кабинеты (административное помещение)	87,9 кв. м	500/D-708041778
Составные части и принадлежности: открытая автостоянка пл. 523 кв. м		

Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 372 600,00 бел. руб.
(снижена на 20 %)
Шаг аукциона – 18 630,00 бел. руб.

Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4: пл. **0,1469 га** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 17/50) для эксплуатации и обслуживания административного здания с магазином. ***Ограничения (обременения) прав:*** после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

Извещения о проведении предыдущих аукционов опубликованы в газете «Звязда»: по лотам №№ 1, 2 – 07.10.2021, по лотам № 3, 4 – 24.07.2021

Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 1–4	**15.11.2021 в 14.00,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата и время начала и окончания приема заявлений по лотам №№ 1–4	**С 09.00 27.10.2021 до 17.00 11.11.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Предмет аукциона, назначенного на 29.11.2021

Местоположение **– Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

Лот № 5

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (номер дома)
Изолированное помещение № 1 (производственное помещение)	206,3 кв. м	600/D-91728	3А-4
Изолированное помещение № 2 (административное помещение)	221,7 кв. м	600/D-91729	3А-4а
Изолированное помещение № 3 (производственное помещение)	288,4 кв. м	600/D-91730	3А-4б
Складское помещение	205,2 кв. м	600/D-40243	3-7

Начальная цена лота № 5 (с НДС 20 %) – 1 694 400,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 84 720,00 бел. руб.

Лот № 6

Административное помещение	233,6 кв. м	600/D-40239	3-5
Административное помещение	83,9 кв. м	600/D-40241	3-6

Начальная цена лота № 6 (с НДС 20 %) – 697 200,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 34 860,00 бел. руб.

Обременение: площади помещений частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

Дата и время проведения аукциона	**29.11.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата и время начала и окончания приема заявлений	**С 09.00 27.10.2021 до 17.00 28.11.2021,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Порядок ознакомления: в рабочие дни по предварительному согласованию, +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене увеличенной на 5 %.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (4 % – по лотам № 1, 2; 2 % – по лоту № 3, 3 % – по лотам №№ 4, 5, 6) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»

(Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49)

сообщает, что внеочередным общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 22 октября 2021 года, принято решение о выплате дивидендов за третий квартал 2021 года – 0 рублей 51 копейка на одну простую (обыкновенную) акцию.

Выплата дивидендов по акциям будет производиться с 25.10.2021 по 31.12.2021.

Порядок выплаты дивидендов акционерам: юридическим лицам – путем зачисления на их расчетные счета, физическим лицам дивиденды выплачиваются через кассу ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» или высылаются почтовым переводом (в пределах Республики Беларусь).

УНП 400078768

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
27 КАСТРЫЧНІКА 2021 г.
СЕРАДА
№ 20 (15919)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Будзем знаёмыя

Уладзіслаў ХАНДОГІЙ:

«Самае галоўнае — заставацца індывідуальным»

Сёлета ён стаў уладальнікам першага месца на прэстыжным Міжнародным конкурсе рускай фартэпіяннай музыкі ў Сан-Рэма. У яго 19 гадоў гэта не першая перамога, за плячыма беларускага творцы — шэраг розных, не менш значных міжнародных музычных спаборніцтваў. Малады чалавек з'яўляецца пераможцам V Міжнароднага конкурсу юнацкага выканаўчага мастацтва імя Р. Свірыдава ў Санкт-Пецярбургу, II Міжнароднага конкурсу юных піяністаў Astana Piano Passion, лаўрэатам II Міжнароднага конкурсу маладых піяністаў Grand piano Competition у Маскве, уладальнікам першай прэміі XV Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкантаў «Шчаўкунок» і Міжнароднага конкурсу піяністаў Ferrol piano competition у Іспаніі. Уладзіслаў Хандогій — фіналіст X Міжнароднага конкурсу юных піяністаў імя Джыны Бахаўэр у Солт-Лэйк-Сіці, а таксама стыпендыят фонду «Новыя імёны». У музыканта ёсць свой дыск, які запісаны на фірме «Мелодыя» ў Маскве. Творчы графік піяніста даволі шчыльны: праекты ў Маскоўскай філармоніі, выступленні ў гарадах Расіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Іспаніі, Італіі, Швейцарыі і другіх краін. Аднак спецыяльна для нас Уладзіслаў знайшоў час у сваім творчым графіку, каб пагутарыць пра ўдзел у нядаўнім конкурсе, расказаць пра тое, каму насамрэч ён удзячны за перамогу і чым здзівіў яго італьянскі Сан-Рэма.

— Уладзіслаў, адкуль у вас любоў да музыкі?

— У мяне бацькі музыканты: маці Таццяна Міхайлаўна працуе ў аркестры пры філармоніі, бацька Пётр Пятровіч — у музычнай школе, раней таксама быў у аркестры. Ёсць старэйшы брат Аляксей, які займаўся на фартэпіяна, хадзіў у музычную школу. Мне вельмі падабалася, калі ён іграў на піяніна, я яго слухаў і пасля пачынаў падбіраць мелодыі, якія чуў. Бацькі ўсё гэта заўважылі і ў сем гадоў адвялі мяне ў музычную школу.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Невядомы БДУ

ТУТ БУДЗЕ ГОРАД-САД

Як у маладой рэспублікі ўвасаблялі амбіцыйны праект універсітэцкага гарадка...

У 1921 годзе спецыяльнай пастановай прэзідыума ЦВК Беларусі ад 18 красавіка быў афіцыйна зацверджаны спіс будынкаў, якія пераходзілі ў карыстанне БДУ. Адначасова ўніверсітэт атрымаў у сваё распараджэнне і землі, прылеглыя да іх. Усе арганізацыі, якія да гэтага часу там размяшчаліся, павінны былі да 1 ліпеня з'ехаць і перадаць універсітэту свае плошчы.

Асобнае месца ў спісе займае будынак гімназіі Зубакіна і Фальковіча. У гісторыю ўніверсітэта ён увайшоў як «Першы дом БДУ», або «Дом № 1 БДУ», бо ў ім фактычна жыў на працоўным месцы рэктар Уладзімір Пічэта, дзейнічалі бібліятэка і канцылярыя, праводзіліся заняткі на рабочым факультэце. Будынак знаходзіўся на скрыжаванні вуліц Магазінная і Кашарная яшчэ з 1863 года (цяпер гэта скрыжаванне Чырвонаармейскай і Кірава).

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Галоўны корпус БДУ.

Далоў стэрэатыпы

«Маштабная» любоў да беларускага аўтапрама

Дзяўчына з Масквы стварае копіі нашых грузавікоў

Прыводзіць той ці іншы механізм да ладу, вяртаць жыццё старой рэчы і захапляцца зусім недзявочымі цацкамі Даша БУРДЗІНА пачала яшчэ ў дзяцінстве. Для дзяўчыны-тэхнара з Масквы такое баўленне часу — цікавая справа. Шэсць гадоў таму суразмоўніца ўсур'ёз пачала захапляцца мадэляваннем. Цяпер у калекцыі нашай гераіні, акрамя шматлікіх мадэляў машын, а гэта больш за 200 экзэмпляраў, зробленых у маштабе 1:35, 1:43 і 1:72, ёсць і прадстаўнікі беларускай аўтавытворчасці. Па словах Дашы, падчас збірання МАЗаў у яе з'явілася моцнае жаданне наведаць нашу краіну, убачыць знакамітыя прамысловыя гіганты — МАЗ, БелАЗ, МТЗ і асабліва МЗКЦ, які вырабляе ўнікальныя шасі для цяжкіх армейскіх установак.

Мадэлізм у жыцці Дашы пачаўся з танкаў. Толькі потым у працэсе вывучэння тэхнікі дзяўчына даведалася, што разнавіднасцяў баявых машын — вялікае мноства.

— Я даўно бачыла ў крамах наборы для зборкі, і аднойчы дзеля цікавасці захацелася набыць адзін на спробу. Купіла, аднак у наборы не было ні клею, ні фарбаў, ні інструмента. Пачала шукаць інфармацыю ў інтэрнэце і зразумела, што гэта цэлая індустрыя, падобная да мастацтва, дзе шмат розных тэхнік і кірункаў, свае маштабы... Гэты вялізны асобны сусвет мяне зацягнуў. І хоць прыцягальнасць да танкаў застаецца моцнай і цяпер новым захапленнем для мяне сталі аўтамабілі, у большасці — рэтра.

Наша гераіня ўпэўнена называе сябе прафесійным блогерам. Спецыяльнасць аўтаматызатара вытворчасцяў у машынабудаванні, набытую ў Маскоўскім дзяржаўным індустрыяльным ўніверсітэце, на жаль, Дашы не ўдалося прымяніць. Пасля заканчэння вучобы дзяўчына павінна была працаваць на ЗіЛе і праектаваць для яго аўтаматызаваныя вытворчыя лініі, аднак пасля трэцяга курса стала зразумела, што завод хутка закрыецца.

— Так, калісьці мне хацелася працаваць на рэальнай вытворчасці. На жаль, калі я паступала ва ўніверсітэт, які рыхтаваў спецыялістаў для ЗіЛа, не ведала ўсю карціну таго, што адбывалася на прадпрыемстве, — тады яно пачало разбурацца. Аднак усё роўна мне ўдалося там пашчыраваць, я працавала на адным з прадпрыемстваў Раскосмасу.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
27 10 2021 г.

ТУТ БУДЗЕ ГОРАД-САД

БУДЫНАК СА СТАГАДОВАЙ ГІСТОРЫЯЙ

Першапачаткова факультэты размясціліся ў будынках, якія належалі да рэвалюцыі Камерцыйнаму вучылішчу, мужчынскай гімназіі, духоўнай семінарыі, жаночаму духоўнаму вучылішчу, ваеннаму шпіталю, губернскай земскай бальніцы. Многія з іх знаходзіліся ў раёне сучаснай вуліцы Кірава, да 1934 года яна мела назву Універсітэцкая. На працягу некалькіх гадоў універсітэту перадалі яшчэ шэраг будынкаў, аднак праблему недахопу памяшканняў вырашыць не атрымалася. Тым больш што ўніверсітэт імкліва развіваўся: ствараліся новыя факультэты, навукова-даследчыя інстытуты, медыцынскія клінікі і іншае.

Самы стары будынак, які захаваўся на тэрыторыі ўніверсітэцкага гарадка (цяпер у ім размяшчаецца рэктарат), расчыніў свае дзверы ў 1925 годзе.

— Будынкі, размешчаныя ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дазваляюць прасачыць амаль усю яго стагадовую гісторыю, — расказвае **загадчыца музея гісторыі БДУ Эма МАЛІНОЎСКАЯ.** — Самы стары, які захаваўся, — цяперашні рэктарат БДУ. Новы вучэбна-лабараторны корпус, пабудаваны на праекце ўніверсітэцкага інжынера Ч. І. Радзевіча, расчыніў свае дзверы ў 1925 годзе. Ён быў узведзены ў тым жа архітэктурным стылі, што і Камерцыйнае вучылішча, перададзенае БДУ, якое размяшчалася недалёка ад яго (зараз на гэтым месцы стаіць Галоўны корпус БДУ, гэта плошча Незалежнасці). У будынку Камерцыйнага вучылішча некаторы час знаходзіліся педагагічны факультэт, Праўленне БДУ. Пазней ён быў перададзены Інстытуту народнай гаспадаркі, які вылучыўся з БДУ.

У жніўні 1944 года студэнты ўбачылі разбураныя ўшчэнт вучэбныя карпусы, інтэрнаты і жылыя дамы.

Самы стары будынак на тэрыторыі сучаснага ўніверсітэцкага гарадка дастаткова добра захаваўся ў гады вайны: у 1945 годзе, пасля аднаўлення, ён зноў прыняў у свае сцены студэнтаў БДУ. І нават пасля яго рэстаўрацыі, якая завяршылася ў 1998-м, захаваў усе рысы помніка архітэктуры пачатку XX стагоддзя.

НЯСПРАЎДЖАНЫЯ НАДЗЕІ

Першы рэктар БДУ Уладзімір Пічэта неаднойчы звяртаў увагу ўлад на неабходнасць узвядзення комплексу будынкаў, дзе размясціліся б усе структурныя падраздзяленні ўніверсітэта.

Нарэшце, у лютым 1926 года быў абвешчаны ўсесаюзны конкурс на архітэктурны праект універсітэцкага гарадка ў цэнтры беларускай сталіцы. Перамог праект маскоўскага архітэктара Івана Запарожца, але яго рэалізацыяй займаўся архітэктар Георгій Лаўроў. У маі 1927 года VIII Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў рашэнне аб будаўніцтве ўніверсітэцкага гарадка. Пад забудову гарадскія ўлады выдзелілі ўчастак у раёне вуліц Савецкай, Ленінградскай, Бабруйскай і прылеглых да іх завулкаў. На месцы будучага ўніверсітэцкага гарадка знаходзіліся старыя яўрэйскія могілкі, прыватны сектар і невялікая абутковая фабрыка, якія падлягалі зносу.

Усяго прадугледжвалася ўвядзенне 12 будынкаў: галоўнага аўдыторнага, анатамічнага, хімічнага, біялагічнага, прыродазнаўчага карпусоў, інтэрната для студэнтаў універсітэта і рабфакаўцаў, двух дамоў пад кватэры выкладчыкаў і яшчэ двух — для абслуговага персаналу, а таксама аранжарэі для трапічных раслін, лазні, пральні, гаража. У аснову кампазіцыі быў пакладзены павільённы прынцып (факультэты павінны былі размяшчацца ў асобных трохпавярховых будынках). У галоўным корпусе на цокальным паверсе збіраліся размясціць студэнцкі інтэрнат на 250 чалавек, а на даху над актавай залай на тысячу месцаў — сад на 900 квадратных метраў. З заканчэннем работ ва ўнутраным дворыку ўніверсітэта планавалася пасадка саду з тысячы дрэў. Гарадок павінен быў заняць 14 гектараў.

6 лістапада 1927 года далі ўрачысты старт будаўніцтву. Аднак не толькі радасць, але і непрыемныя клопаты прынесла калектыву ўніверсітэта і студэнтам будоўля.

— Не чакаючы яе заканчэння, БДУ сталі высяляць з памяшканняў, якія ён займаў, — расказвае **загадчык кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ, кандыдат гістарычных навук, прафесар Алег ЯНОЎСКІ.** — Між тым узвядзенне аб'ектаў зацягвалася. Не дапамагалі і перыядычныя суботнікі з удзелам студэнтаў. Першапачатковы архітэктурны праект прыйшлося мяняць, адмаўляючыся ад найбольш затратных рашэнняў. Нягледзячы на патанненне кошту будаўніцтва (першапачаткова каштарыс складаў велізарную суму — 6,4 млн рублёў), грошай у краіне на яго завяршэнне ўсё роўна не хапала. У 1930 годзе выдаткі на будоўлю давялося ўключыць у саюзны бюджэт. Доўгачаканае адкрыццё ўніверсітэцкага гарадка было прымеркавана да 13-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аднак гэта важная для гісторыі ўніверсітэта падзея хутка страціла сваю значнасць.

Па-першае, шэраг будынкаў атрымалі самастойныя ВНУ, якія вылучыліся са складу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў працэсе яго разузбуйнення. Па-другое, БДУ і гэтыя вышэйшыя навучальныя ўстановы занялі толькі частку здадзеных у эксплуатацыю плошчаў. І зусім хутка ўніверсітэт стаў адчуваць недахоп памяшканняў яшчэ больш востры, чым да пачатку будаўніцтва.

Пагоршылася становішча іншагародніх студэнтаў, пасля таго як гарадскі Савет Мінска забраў у БДУ некалькі інтэрнатаў. Палова студэнтаў жылі ў бараках, размешчаных у раёне прыватнага сектара за чыгуначным вакзалам. У 1939 годзе ўніверсітэт займаў на тэрыторыі гарадка тры карпусы — біялагічны (сучасны геаграфічны факультэт), хімічны (сучасны НДІ ядзерных праблем) і фізіка-матэматычны (сучасны рэктарат). Так, у біялагічным корпусе былі сканцэнтраваныя біялагічны, гістарычны, рабочы факультэты, уся адміністрацыя, бібліятэка і студэнцкія арганізацыі. Студэнты гістфака вымушана займаліся ў хімічных лабараторыях і заалагічным музеі.

У ліпені 1940 года рэктар Парфён Пятровіч Савіцкі звярнуўся да старшыні Савета народных камісараў СССР, каб не дапусціць далейшага скарачэння базы БДУ. Галоўны корпус, дзе займаліся студэнты-гуманітарыі, збіраліся перадаць ваенным. Пральня, душ і медпункт канфіскоўваліся на карысць радыёзавода. Савет народных камісараў БССР меў намер заняць частку хімічнага корпуса. У інтэрнатах універсітэта востра не хапала месцаў для студэнтаў новага набору...

НА РУІНАХ

Падчас Вялікай Айчыннай вайны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аднавіў сваю дзейнасць у 1943 годзе на падмаскоўнай станцыі Сходня. Калі 3 ліпеня 1944 года стала вядома аб вызваленні Мінска, адбыўся ўніверсітэцкі мітынг, падчас якога рэктар павіншаваў прысутных з найвялікшым святам. У канцы ліпеня ў Мінск выехала група студэнтаў і выкладчыкаў (75 чалавек) для аднаўлення і падрыхтоўкі ўніверсітэцкіх будынкаў да вучэбнага года. Другая група студэнтаў (26 чалавек) адправілася ў сталіцу БССР 11 жніўня. Яны ўбачылі жудасную карціну: горад быў разбураны, адсутнічалі святло і вада. Ад галоўнага корпуса БДУ засталіся адны сцены, на некаторых з іх было напісана «Мініравана». На сценах трохпавярховага будынка, дзе размяшчаліся часці СС, студэнты ўбачылі надпісы «Адпомсціце за нас», «Мы паміраем за Радзіму», «Не вынес катаванняў, але не выдаў».

Да вайны пры ўніверсітэце дзейнічалі тры багатыя музеі, велізарная бібліятэка. Універсітэт меў сем інтэрнатаў. У жніўні 1944 года студэнты ўбачылі разбураныя ўшчэнт вучэбныя карпусы, інтэрнаты і жылыя дамы. Навуковае і вучэбнае абсталяванне, бібліятэка, архіў, музейныя фонды былі вывезены акупантамі або знішчаны. У цэлым шкода склала 37 млн рублёў (без кошту памяшканняў). Прыйшлося ўсё пачынаць спачатку.

Адміністрацыя размясцілася ў двухпавярховым «чырвоным» корпусе фізіка-матэматычнага факультэта, які быў разбураны часткова. Студэнты прыступілі да аднаўлення гэтага будынка, а таксама інтэрната на вуліцы Няміга і дома па вуліцы Віцебскай (тут былі адкапаныя скрыні з посудам, прыборамі, схаваныя ў гады вайны выкладчыкамі). На працягу двух месяцаў студэнты змайстравалі лаўкі для аўдыторый і стэлажы для бібліятэкі. Вучэбны год павінен быў пачацца 15 кастрычніка, але ў гэты дзень да заняткаў прыступілі толькі першакурснікі (420 чалавек). Са спазненнем, 22 кастрычніка, прыбыў эшалон са Сходні, у якім ехалі выкладчыкі, студэнты, у ім было таксама навучальнае і навуковае абсталяванне. Выкладчыкі, якія прыехалі, размясціліся разам з сем'ямі ў доме па вуліцы Клары Цэткін.

У пасляваеннай гісторыі БДУ 1944/1945 вучэбны год стаў самым цяжкім. Адчуваўся востры недахоп навучальных плошчаў. Хімічны, фізіка-матэматычны факультэты, адміністрацыя, рэктарат, гаспадарчая частка, чытальная зала, бібліятэка размясціліся ў адноўленым двухпавярховым корпусе на тэрыторыі ўніверсітэцкага гарадка. Кожная кафедра займала па адным пакоі, дзе выкладчыкі чыталі лекцыі, вялі лабараторныя заняткі. Заняткі на філфаку і гістфаку праходзілі ў школе № 2 па вуліцы Энгельса. Геаграфічны і біялагічны факультэты займаліся ў будынку тэхнікума па вуліцы Віцебскай. Не хапала не толькі памяшканняў, але і мэблі, не працавала ацяпленне, не было асвятлення.

Іншагародняя студэнты мелі вострую патрэбу ў жыллі. Адведзеныя пад інтэрнаты два дамы па вуліцы Няміга змясцілі не больш як 180 чалавек. Частку студэнтаў пасялілі ў бараках на тэрыторыі ўніверсітэцкага гарадка. Пад інтэрнаты нават прыйшлося прыстасаваць вучэбныя аўдыторыі: ноччу студэнты там спалі (па 30—80 чалавек), а з раніцы хуценька рыхтавалі сняданне, прыбіраліся, і распачыналіся заняткі. Узімку студэнты рыхтаваліся да заняткаў у ложках пад коўдрамі, для асвятлення выкарыстоўвалі самаробныя свяцільні на газе. Але паступова ўніверсітэцкая база аднаўлялася. Вялікая роля ў гэтым належала самім студэнтам, якія працавалі не толькі на тэрыторыі ўніверсітэта, але і дапамагалі адбудоўваць Мінск, удзельнічалі ў агульнагарадскіх суботніках.

Так выглядаў універсітэцкі дворык у 1930-я гады.

У 1944 годзе Мінскі гарсавет абавязаў кожнага студэнта адпрацаваць на аднаўленні горада штомесяц па 15 гадзін. Студэнты, у сваю чаргу, прынялі павышаныя абавязацельствы — адпрацаваць па 20 гадзін. Кожны з іх лічыў, што сваёй працай, стараннем у вучобе набліжае доўгачаканы дзень Перамогі.

Дарэчы, галоўны корпус БДУ, у які ў чэрвені 1941 года трапіла нямецкая бомба, у некалькі змененым архітэктурным абліччы захаваўся па сённяшні дзень — ён «схаваны» за сучасным фасадам БДПУ імя М. Танка. Справа ў тым, што, акрамя праўлення БДУ, дэканатаў, актавай залы, інтэрната для студэнтаў і г. д., у ім размяшчаліся аўдыторыі факультэта права і гаспадаркі, а таксама педагагічнага факультэта. Апошняму, калі ён быў ператвораны ў педінстытут, і дастаўся будынак. У 50-я гады ён быў рэканструяваны, але застаўся без левага крыла — на яго месцы зараз знаходзіцца выезд з плошчы Незалежнасці на мост, які вядзе на вуліцу Маскоўскую.

КРОК ЗА КРОКАМ

Да пачатку 1948/1949 вучэбнага года пры дапамозе студэнтаў быў адноўлены разбураны біялагічны корпус, у якім размясціліся біялагічны, геаграфічны, філалагічны і гістарычны факультэты. У 1949/1950 вучэбным годзе пачаліся заняткі ў хімічным корпусе. Улетку 1949 года былі адрамантаваны інтэрнаты, размешчаныя на вуліцах Няміга, Маскоўскай, Віцебскай, а таксама дамы для выкладчыкаў па вуліцах Кірава і Клары Цэткін.

6 лістапада 1927 года далі ўрачысты старт будаўніцтву. Аднак не толькі радасць, але і непрыемныя клопаты прынесла калектыву ўніверсітэта і студэнтам будоўля.

У маі 1957 года Савет Міністраў БССР прыняў пастанову аб будаўніцтве ў 1957—1959 гадах галоўнага корпуса ўніверсітэта. Але ўжо неўзабаве, у ліпені 1957 года, у новай сумеснай пастанове ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР прадугледжвалася будаўніцтва, акрамя галоўнага корпуса, інтэрната на 800 месцаў, жылога дома для работнікаў БДУ і студэнцкай сталовай. На многія гады рэалізацыя гэтага праекта стала галоўным клопатам рэктара Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі, які вельмі сур'ёзна паставіўся да сваіх новых абавязкаў і з галавой паглыбіўся ў працу. «Пытанне аб Беларускім дзяржаўным універсітэце ставіцца як пытанне нацыянальнай палітыкі», — заявіў ён на пасяджэнні рэктарата 12 кастрычніка 1957 года.

Адкрыццё галоўнага корпуса БДУ, якое адбылося, праўда, некалькі пазней за вызначаныя тэрміны, стала важнай падзеяй у развіцці ўніверсітэта. Былі створаны ўмовы для пашырэння старых і стварэння новых факультэтаў, кафедраў і лабараторый.

Менавіта за 1957—1972 гады, калі Беларускім дзяржаўным універсітэтам кіраваў Антон Сеўчанка, былі пабудаваны і абсталяваны вучэбныя карпусы і інтэрнаты, якія застаюцца асноўнай яго вучэбна-навуковай базай да нашых дзён. І тым самым створаны падмуркі для далейшага развіцця галоўнага ўніверсітэта краіны.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота з архіва Музея гісторыі БДУ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

«НЕЙРАСЕТКА» ДЛЯ ПАРТНЁРАЎ

БДУ прымае віншаванні са 100-годдзем ад універсітэцкіх партнёраў.

Віншавальныя лісты прыходзяць у фармаце відэазваротаў, афіцыйных паштовак і дыпломаў. Пазнаёміцца з іх зместам можна на сайце БДУ ў раздзеле «Віншаванні партнёраў БДУ».

Акрамя таго, на сайце ўніверсітэта дадзены старт анлайн-праекту «Карта віншаванняў». Прымаюцца падзячныя словы ад студэнтаў, супрацоўнікаў, выкладчыкаў, выпускнікоў, партнёраў і ўсіх ахвотных з розных куткоў кантынента.

Пакінуць успаміны і пажаданні можна на рускай, беларускай, англійскай і кітайскай мовах. Тэкст пажаданняў і месца пражывання яго аўтара аўтаматычна знаходзяць адлюстраванне на электроннай карце, якая ахоплівае ўсе краіны і гарады свету.

30 кастрычніка БДУ адзначыць сваё стагоддзе. За векавую гісторыю ўніверсітэта яго выпускнікамі сталі больш за 185 000 чалавек, у тым ліку звыш 15 тысяч замежных спецыялістаў, магістрантаў, аспірантаў. Дарэчы, першых замежных студэнтаў БДУ прыняў у 1961 годзе. У цяперашні час іх колькасць перавысіла 4000 чалавек з 60 краін.

Таксама ў Беларускім дзяржаўным універсітэце да 100-гадовага юбілею абнавілі сцяну партнёраў ВНУ. Размешчана яна на другім паверсе рэктарата каля залы пасяджэнняў Савета БДУ. Тут праходзяць важныя мерапрыемствы, цырымоніі ўзнагароджання, сустрэчы ганаровых гасцей і рабочыя нарады. Кампазіцыя прызначана для адлюстравання шматграннасці міжнароднай дзейнасці беларускай ВНУ і выказвання падзякі партнёрам за эфектыўнае супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі.

У аснову маштабнага малюнка пакладзены сімвал «папараць-кветка», якая ўвасабляе асвету і імкненне да ведаў, а ідэя пераемнасці і міжвузаўскіх сувязяў раскрытая праз вобраз нейрасеткі, што аб'ядноўвае розныя пакаленні і сусветную ўніверсітэцкую супольнасць. Дапаўняюць экспазіцыю вытанчаныя шкляныя шыльды з назвамі ВНУ-партнёраў, з якімі ў цяперашні час найбольш актыўна супрацоўнічае БДУ.

Усяго Беларускім дзяржаўным універсітэтам заключана больш за 500 пагадненняў з універсітэтамі з 59 краін, у ліку якіх Расія, Кітай, Узбекістан, Германія, Польшча, Японія, Ізраіль, Інданезія, Швейцарыя, Егіпет, Аман, Казахстан і іншыя. Найстарэйшым і дзеючым дакументам міжнароднага супрацоўніцтва з'яўляецца дагавор 1967 года аб навуковым і культурным супрацоўніцтве з Енскім універсітэтам імя Ф. Шылера (Германія).

Дарэчы, акцэнт на міжнародных навуковых і адукацыйных сувязях рабіў яшчэ ў 1920-х гадах першы рэктар БДУ Уладзімір Пічэта. У гады яго кіравання арганізоўваліся навуковыя камандзіроўкі супрацоўнікаў ВНУ ў Германію, Літву, Чэхію, Польшчу і іншыя краіны. У пасляваенны час міжнародныя кантакты БДУ аднавіліся ў жніўні 1955 года. Тады на навучанне ў беларускую ВНУ прыехалі 10 студэнтаў з Польшчы. У наступным годзе для вучобы па індывідуальнай праграме на філалагічны факультэт БДУ быў накіраваны студэнт з Канады. А ў першай палове 1960-х гадоў пачаліся студэнцкія абмены. Акрамя таго, з 1 верасня 1961 года БДУ стаў першай у Беларусі і адной з чатырох ВНУ Савецкага Саюза па навучанні замежных грамадзян на падрыхтоўчым факультэце.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У АКТЫЎНЫМ РЫТМЕ

Танец — таемная мова душы...

Усе студэнты журфака мараць аб падарожжах, сустрэчах з цікавымі людзьмі, адбыцца ў прафесійным плане, навучыцца валодаць словам і інфармацыяй. А разам з тым мы такія ж людзі са сваімі хобі, творчымі планамі, асабістымі амбіцыямі. Журналіст не проста пераносіць навіны, часам ён сам з'яўляецца цікавай крыніцай і скарбніцай талентаў. Я хачу расказаць пра сваю аднакурсніцу Ганну Ровіну і яе захапленні.

Яшчэ да паступлення яна была ўпэўненая, што журналістыка — прафесія яе мары. Будучы супрацоўнік сродкаў масавай інфармацыі спадзявалася паступіць у замежную ВНУ, аднак па збегу акалічнасцяў падала дакументы ў БДУ. Ганна зусім не шкадуе аб такім выбары і нават рада, што ўсё склалася менавіта так.

У першыя тыдні вучобы дзяўчына праявіла ініцыятыву на месца старасты, з чым добра спраўляецца і па гэты дзень. Нягледзячы на актыўнае студэнцкае жыццё, яна таксама захапляецца рознымі хобі: піша вершы і прозу, займаецца спартыўным турызмам і танцамі. Апошняе з пералічанага займае асаблівае месца ў жыцці Ганны, аб чым дзяўчына падзялілася з намі.

У чатыры гады бацькі адвялі дачку на гімнастыку — з гэтага моманту пачалося яе танцавальнае жыццё. Да 14 гадоў дзяўчына паспрабавала сябе ў розных напрамках: народны танец, класічны, сучасны, усходні. А потым медыкі паставілі дыягназ «скаліёз». Было цяжка справіцца з унутранымі эмоцыямі, бо дзесяць гадоў упартай працы над сабой маглі быць марныя.

Але потым Ганна паехала ў лінгвістычны лагер, дзе пазнаёмілася са сваім будучым партнёрам Паўлам Ермаковічам. Менавіта ён змог вярнуць дзяўчыне веру ў сябе і пазнаёміў з гістарычным танцам і танга. На дадзены момант яны — пара. Адна з перашкод, якую спрабуюць перажыць, — гэта адлегласць. Павел вучыцца ў Санкт-Пецярбургскім універсітэце грамадзянскай авіяцыі на пілота.

Танец, на думку дзяўчыны, — гэта маленькая гісторыя, якую ты перажываеш і спрабуеш данесці гледачу праз рухі. «Я прыхільніца таго, каб укладваць у танец сваю сутнасць і думкі», — падзялілася дзяўчына. Кожны чалавек шукае ў свеце натхненне, каб зарадзіць сябе на творчасць, на працу. Ідэямі для танца можа стаць усё што заўгодна: літаратура, фільмы, спектаклі ці нейкая падзея.

Стварэнне паўнавартаснай танцавальнай гісторыі займае нейкі час. Рухі, якія могуць стаць часткай твора, часцей за ўсё атрымліваюцца выпадкова. «Мы спрабавалі зрабіць адно — атрымалася іншае. І дадаём». Бываюць выпадкі, калі Ганна і Павел шукаюць рухі праз майстар-класы, відэа, заняткі ў харэографаў. І на выхадзе атрымліваецца сапраўдная гісторыя, поўная адпаведных эмоцый і пачуццяў.

Пара ўжо праявіла сябе ў Санкт-Пецярбургу на Мікалаеўскім балі, у ліцэі, які скончыла Ганна. І на гэтым яны не збіраюцца спыняцца. У Беларусі штогод праходзіць Восеньскі баль, прысвечаны пераправе праз Бярэзіну, у Мірскім замку вясной.

У Ганны ёсць фаварыт сярод усіх відаў танца — гэта танга. Нядзіўна, бо гэта запал у поўным значэнні і ўвасабленні гэтага слова. Адпаведна, гэты кірунак мае найбольшую прастору для творчасці. Многія лічаць, што танга бывае толькі гарачым, аднак гэта не зусім так. Танец таксама можа быць і сумным, і пачуццёвым.

Касцюмы для кожнага танца розныя — усё залежыць ад мерапрыемства і віду выступлення. Напрыклад, для танга гэта можа быць і адзенне з паўсядзённага жыцця. Што датычыцца гістарычных танцаў — для іх касцюмы шыюцца ў атэлье, у тым ліку і ў тых, што займаюцца рэканструкцыяй гістарычнага касцюма розных эпох.

Як лічыць Марта Грэм (амерыканская танцорка і харэограф), «танец — таемная мова душы». Гэта праўда. І каб даведацца, аб чым кажа душа маёй суразмоўніцы Ганны, варта хоць раз убачыць, як яна танцуе разам са сваім партнёрам.

Антон АНТОНАЎ, студэнт II курса факультэта журналістыкі БДУ.
Фота з архіва герояў.

«Маштабная» любоў да беларускага аўтапрама

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Цяпер у штодзённым графіку дзяўчыны мадэлізм займае каля трох гадзін. Звычайна за работу яна любіць садзіцца ўвечары, калі нішто не перашкаджае і можна засяродзіцца на справе. Час выканання залежыць ад складанасці канкрэтнай мадэлі: адна можа быць больш складанай у зборцы, але лёгкай у афарбоўцы і наадварот. У сярэднім над адной копіяй тэхнікі ў мініяцюры дзяўчына працуе каля трох тыдняў.

Яшчэ адна любімая тэматыка суразмоўніцы — савецкія аўтамабілі, у асноўным ЗіЛы і КАМАЗы, таксама ў партфоліа майстрыхі ёсць некалькі копій грузавікоў Мінскага аўтазавода. Увогуле, калекцыя беларускага аўтапрама ў Дашы складаецца з цэлай серыі машын

на базе МАЗ-200: дзвюх мадэляў МАЗ-200 — гэта аўтагудранатар, і другой, шыкоўнай мадэлі, з пажарнай устаноўкай і рухавіком ад самалёта МіГ-15. Ёсць самазвал МАЗ-5551, гэта была першая мадэль МАЗа, якую стварыла майстар. Ёсць два аўтацягнікі з цягачоў МАЗ-6422 і МАЗ-5432 з прычэпамі МАЗ-9506-30 і МАЗ-93971 адпаведна, бартавы грузавік МАЗ-6303. Ёй падабаюцца кар'ерныя самазвалы МАЗа, бо гэтыя экзэмпляры ў любой калекцыі выглядаюць выйгрышна. Таксама Даша мае дзве сучасныя копіі МАЗаў-цягачоў, самазвала і бартавога грузавіка. У планах дзяўчыны — сабраць што-небудзь з сямейства МАЗ-543. Па яе словах, гэта брутальныя машыны, ні на што не падобныя, а таксама яна марыць дадаць у шэраг сваіх «жалезных коней» прадстаўнікоў іншых аўтазаводаў Беларусі.

— Мяне прываблівае дызайн старых аўто смеласцю і вытанчанасцю формаў, мае любімцы — ЗІЛ-130 і МАЗ-200, у форме іх кабін знаходжу нешта чалавечае. Мяне захапляе больш сам працэс работы з мадэллю, чым іх калекцыяніраванне, у якім, лічу, няма межаў.

Акрамя мадэлізму, Дар'і падабаецца роспіс на шкле. Гэта дапамагае ў яе хобі: некаторыя прыёмы выкарыстоўваюцца ў стварэнні копій аўтамабіляў. Напрыклад, для роспісу празрыстых дэталяў, накшталт сірэн пажарных машын альбо фар ці стоп-сігналаў.

Як ні дзіўна, сама дзяўчына не кіруе аўто, хоць пасведчанне кіроўцы мае. А для таго, каб стварыць сапраўдныя прататыпы машын, якія ездзяць кожны дзень на вуліцы, майстар назірае за аўто ў самых што ні ёсць рэальных умовах. Фатаграфуе тыя месцы, якія найбольш цікавяць, напрыклад, сколы на кабіне альбо дзе больш за ўсё збіраецца пыл, з'яўляецца ржа. Потым імкнецца паўтарыць усё ў дэталях на мадэлі.

— Працэс састарвання копій машын называецца везерынгам — тэхніка нанясення слядоў уздзеяння надвор'я і знешніх фактараў. У першую чаргу я вывучаю выгляд машыны, афарбоўку, як псуецца фарба ў працэсе эксплуатацыі, як кладзецца бруд.

У кватэры нашай суразмоўніцы машынкі захоўваюцца ў пластыкавых боксах адзін на адным. Таму калекцыя ў кватэры выглядае дастаткова кампактна. Да таго ж, дзякуючы блогу, Даша супрацоўнічае з рознымі спецыялізаванымі крамамі зборных мадэляў, якія дасылаюць наборы, таму гэтае хобі амаль не патрабуе грошай. У профі ёсць мара адкрыць сваю краму-клуб стэндавага мадэлізму ў Маскве, а ў лепшым выпадку — арганізаваць вытворчасць маштабных мадэляў і стаць паўнавартасным вытворцам.

— Выстаўкі праводзіць не планую, бо мой YouTube-канал, па сутнасці, і ёсць выстаўка мадэляў і ўбачыць яе можа кожны ахвотны ў любы час!

Цяпер у дзяўчыны каля 23 тысяч падпісчыкаў, YouTube падарыў ёй вялікую колькасць сяброў, якія заўсёды падказваюць, як палепшыць работы, дзеляцца досведам, калі-нікалі хваляць. Дзякуючы ім, яе ўменні ў мадэлізме значна палепшыліся.

Надзея ЗУЕВА.
Фота з уласнага архіва гераіні.

SEX=БАЛЯСЫ

ВО «ПАПАЛІ»!

Нічога, як той казаў, не прадвяшчала... («Каханы мужчына — гэта той, які бачыў вас п'янай, аголенай, без макіяжу, у слязах, слухаў вашу розную лухту і, як ні дзіўна, які дагэтуль з вамі».) Шпацырую неяк па рэдакцыйным калідоры лёгкай джазавай паходкай, а насустрач з пакоя выходзіць каляжанка. І нечакана пытаецца: «Ты ведаеш словы гэтай песні?». І пачынае напяваць матыў. Крыху сумеўшыся ад нечаканасці, я праз секунду ў адказ: «Ты адэсіт, Мішка, а гэта значыць...» Каляжанка: «Во! Адэсіт!». Вяртаецца ў пакой, з якога выйшла і гучна гаворыць іншай супрацоўніцы: «Адэсіт, а не трансвестыт!» Такім чынам, тэма сённяшніх нататак — як людзі «паляцца» ў самых розных сітуацыях.

Дык вось, карыстальніца TikTok з ЗША распавяла, як ёй удалося выкрыць здраду і выгнаць нявернага хлопца. Па словах Бейлі Хантэр, яна падслухала, пра што той гаварыў у сне, і запомніла жаночыя імя і прозвішча, якія ён прамовіў. Назаўтра яна спытала ў яго, хто гэта. Той адказаў, што так клікалі дзяўчыну, якая калісьці вучылася з ім у школе. («Калі жанчына сходзіцца з табой, не кахаючы, яна прымусіць цябе расплаціцца за гэта. А калі яна кахае, дык прымусіць цябе заплаціць яшчэ даражэй».) Хантэр не паверыла і напісала ёй у Facebook. «Яна кажа: «Не лезь не ў сваю справу, ты проста яго ненармальная былая». Я такая: «Якая былая, прабачце? Ён жыве ў мяне дома, ездзіць на працу на маёй машыне, яго тэлефон аплачаны мной, я цалкам не былая», — расказала жанчына ў TikTok. («Наварыла баршчу, бульбачкі, насмажыла грыбочкаў і мяса, нарэзала агурок... Сяджу, гляджу на ўсё гэта: чагосьці не хапае — ці то мужыка, ці то гарэлкі».)

